# Паміж ЕС і Расіяй: Геапалітычныя гульні ў Беларусі

ДЭВІД Р. МАРПЛЗ*

Трохкалейныя стасункі паміж Беларуссю, Расіяй і Еўрапейскім Саюзам часта абмяркоўваліся. Асаблівая ўвага прытым аддавалася ўяўнаму перацягванню каната за лаяльнасць Беларусі паміж двума цэнтрамі сілы. З аднаго боку той канат цягнуў традыцыйны хаўруснік і рэгіянальная дзяржава; з другога боку – важны эканамічны партнёр з уласнымі палітычнымі амбіцыямі.

Але гэтыя стасункі радзей апісваліся з гледзішча іх вызначальнай характэрнай рысы – як зручнага інструмента, выкарыстоўванага рэжымам Лукашэнкі ў Беларусі, каб утрымацца на плаву. Афіцыйная Беларусь дасягнула гэтага поспеху цэлым шэрагам спосабаў, якія будуць разгледжаныя ў гэтым артыкуле.

Хоць стасункі з ЕС пагоршыліся ў сувязі з жорсткім разгонам дэманстрантаў пасля прэзідэнцкіх выбараў у снежні 2010 года ў Беларусі, стасункі з Расіяй, што былі халодныя ў 2008–2010 гадах, да канца апошняга (2010) года палепшыліся, і Беларусь пачала адыгрываць больш актыўную ролю ў АДКБ (Арганізацыя Дамовы аб калектыўнай бяспецы) ды карыстацца прывілеяваным становішчам, што ўлучала зніжаныя цэны на імпартаваныя нафту ды газ.

З другога боку, мяркуючы па афіцыйных заявах, да 2012 года Беларусь стала дэманстраваць большую стрыманасць з продажам сваіх каштоўных кампаніяў Расіі. Многія беларусы асцерагаюцца наступстваў падвышэння цэнаў на расійскую энергію або зніжэння беларускага імпарту, і таму на пачатку 2013 года бадай не было нечаканым пабачыць прэзідэнта, які зноў звяртаецца да Бруселя з аліўкавай галінкай у руках (Коровенкова 2013).

Гэты артыкул спрабуе адказаць на пытанне, ці можа цяперашні беларускі рэжым працягваць маніпуляваць сваімі стасункамі паміж двума цэнтрамі ды выжываць насуперак росту вонкавага і ўнутранага ціску з боку ЕС і Расіі ды эканамічным цяжкасцям, якія з’явіліся ў 2009 годзе і ствараюць праблемы дагэтуль.

---

* Дэвід Р. Марплз – доктар філасофіі, ганаровы прафесар кафедры гісторыі і класікі Ўніверсітэта Альберты (Канада), прэзідэнт Паўночна-амерыканскай асацыяцыі беларускіх даследаванняў.

У якасці аднаго з дадатковых пытанняў артыкул разглядае праблему, якую ён успрымае як ключавое пытанне палітыкі ЕС у дачыненні да Мінску – ці з’яўляецца яна мэтазгоднай, апраўданай і ці мае патэнцыял для поспеху. Каб адказаць на гэтае пытанне, я палічыў неабходным падрабязна зазірнуць у гісторыю стасункаў паміж ЕС і Беларуссю цягам апошніх шасці гадоў на ўзроўні элітаў і высветліць прычыны цяперашняга тупіка. Я прысвяціў менш месца гісторыі стасункаў з Расіяй, якая вымагае больш падрабязнага разгляду.

Заўважу, аднак, што Беларусь пагаджалася ўрэшце на членства ў розных кіраваных ці дамінаваных Расіяй утварэннях, але яны дагэтуль значылі вельмі няшмат. Сярод іх – СНД, Саюз Беларусі і Расіі, АДКБ і, нарэшце, Мытны саюз з Расіяй і Казахстанам. Беларусь брала ўдзел, прынамсі, у гэтых ранейшых структурах без энтузіязму, часткова таму, што ўмовы членства ніколі не былі дастаткова распрацаваныя, або таму, што Мінск лічыў ролю Масквы ў іх завялікай.

Найбольш важны аспект для Мінска – эканамічны, гэта значыць, ступень залежнасці Беларусі ад Расіі і ўплыў гэтай залежнасці на палітычнае партнёрства. Галоўны акцэнт у артыкуле робіцца на двух гадах пасля прэзідэнцкіх выбараў снежня 2010 года, але, каб забяспечыць уводзіны ў гэты перыяд, мы паглядзім падрабязней на яго пярэдадзень у 2006–2010 гадах, г. зн. перыяд, які наследаваў за пашырэннем ЕС, што ахапіла суседзяў Беларусі – Латвію, Літву і Польшчу – у 2004 годзе.

## Стасункі з ЕС, 2006–2010 гады

Шэраг навукоўцаў рабілі намаганні прааналізаваць тэму палітыкі ЕС у дачыненні да Беларусі. Некаторыя з іх даволі крытычна паставіліся да рэакцыі Брусэля на падзеі ў гэтай усходняй краіне ды даводзілі, што палітыцы ЕС бракуе паслядоўнасці або што яго абыходжанне з Беларуссю – асабліва ўвядзенне санкцыяў – грунтуецца на маральных паводзінах, а не на патрэбах прагматычнага падыходу, арыентаванага на ангажаванне. Напрыклад, у 2009 годзе Жызэль Бос піша, што “падыход ЕС у дачыненні да Беларусі выразна разрываецца паміж ідэалістычнымі каштоўнасцямі прасоўвання дэмакратыі і (збольшага рытарычнай) падтрымкі знізу ўверх грамадзянскай супольнасці, з аднаго боку, ды рэалістычнай задачай падтрымкі “дзяржаўнай стабільнасці” праз дапамогу стратэгічнаму інстытуцыйнаму будаўніцтву, з другога боку” (Bosse 2009, 224). Іншы аналітык прыйшоў да больш крытычнай высновы: “...ЕС працягвае разглядаць наладжванне партнёрскіх дачыненняў з краінамі Ўсходняй Еўропы ў катэгорыях “кантролю”, а не “доступу” і застаецца стрымана няўважлівым да культурнай і геапалітычнай разнастайнасці яе наваколля ды межаў іншых” (Korosteleva 2009, 243).

Іншыя даследнікі гэтаксама крытыкавалі выкарыстанне і пашырэнне санкцыяў у дачыненні да Беларусі як сродку пакарання за яе адмову вызваліць палітычных зняволеных. Яны сцвярджалі або што палітыка ЕС з'яўляецца супярэчлівай, асабліва ў дачыненні да дзяржаваў – чальцоў Усходняга партнёрства, бо яна выбарачна карае Беларусь, або што санкцыі неэфектыўныя і вядуць да непажаданага выніку, бо няўмольна забяспечваюць дрэйф краіны ў арбіту Расіі як гаранту эканамічнай і палітычнай бяспекі (Мельянцов и Пикулик 2012 і Ioffe 2012). Карацей кажучы, сцвярджалася, што санкцыі асуджаныя на правал, а вось узаемадзеянне будзе больш прадуктыўнай палітыкай, хай сабе гэта і азначала б ігнараванне больш жорсткіх аспектаў мінскага рэжыму. Ці можна прызнаць гэта лагічным падыходам?

У адной з працоўных аналітычных запісак Балаш Ярабік і Алістар Рабальяці ацэньваюць узровень прысутнасці ЕС у Беларусі як занадта нізкі. Яны падмацоўваюць сваё меркаванне спасылкай на тое, што ў Мінску працавалі толькі адзінаццаць еўрапейскіх пасольстваў і не было Дэлегацыі Камісіі, прычым апошняя адсутнічала, бо яе адкрыццё было адкладзенае з прычыны адсутнасці фінансавання, таму што краіна не лічыцца прыярытэтнай. Яны пішуць таксама пра “недастатковую бачнасць” ЕС у Беларусі і тое, што ён не мае інструментаў для ўзаемадзеяння з мясцовым насельніцтвам. Яны лічаць апошні аспект другім найважнейшым палітычным кірункам, тады як першы палягае ў тым, што “дыялог” павінен залежаць ад дэмакратычных рэформаў. І хоць краіна штогод атрымлівала ад Еўрапейскай Камісіі дапамогу на суму 10 млн еўра, гэтыя грошы ішлі ў асноўным праз праграму TACIC на канкрэтныя праекты, такія як гуманітарная дапамога для вырашэння праблемаў, звязаных з ядзернай аварыяй 1986 года на Чарнобыльскай АЭС, ядзерная бяспека і рэгіянальныя мерапрыемствы, а не прасоўванне дэмакратыі, адукацыю і дапамогу няўрадавым арганізацыям. Сярод іх рэкамендацыяў – падвышэнне ўплыву ЕС, прасоўванне энергаэфектыўнасці, спрыянне больш цесным кантактам з суседзямі і перагляд пытання пра кошт шэнгенскіх візаў для жыхароў Беларусі, а таксама стварэнне Еўрапейскага фонду за дэмакратыю.

Яны таксама хацелі б пабачыць лепшыя сродкі для падтрымкі палітычных партыяў, у прыватнасці дамагчыся дазволу абыходзіць абмежаванні Фінансавай інструкцыі ЕС (Jarabik and Rabagliati 2007, 1–2,14–15). Іх артыкул з цягам часу крыху састарэў, але яго агульная крытыка застаецца актуальнай. З другога боку, уплыў ЕС за пяць гадоў, здаецца, значна падвысіўся, не ў апошнюю чаргу дзякуючы праеўрапейскім палітычным платформам, з якімі выступалі некалькі кандыдатаў ад апазіцыі на прэзідэнцкіх выбарах 2010 года.

Першапачатковыя стасункі незалежнай Беларусі з ЕС былі падарваныя канстытуцыйнымі папраўкамі рэжыму Лукашэнкі і рэферэндумамі 1995 і

1996 гадоў, у выніку якіх улада парламента і Канстытуцыйнага суда была моцна абмежаваная, а ў краіне была ўсталяваная сістэма аўтарытарнага прэзідэнцкага кіравання.

Гэтыя крокі паследавалі за раннім перыядам, што даваў некаторыя надзеі на больш дэмакратычны шлях развіцця пасля таго, як улетку 1991 года Беларусь станавілася незалежнай дзяржавай, а Станіслаў Шушкевіч стаў беспартыйным лідарам парламента. У 1989 годзе Еўрапейская супольнасць падпісала Пагадненне аб гандлі і супрацоўніцтве з СССР, за якім паследавала Пагадненне аб партнёрстве і супрацоўніцтве (ППС) з Рэспублікай Беларусь (1995), а таксама Часовае гандлёвае пагадненне, якое мусіла дзейнічаць, пакуль усе чальцы не ратыфікуюць ППС. Захады рэжыму прэзідэнта Лукашэнкі перапынілі гэты працэс, і ў 1997 годзе стасункі былі замарожаныя, а ратыфікацыі ППС – прыпыненыя. Пасля гэтага ніякіх кантактаў на высокім узроўні з беларускім урадам не было (Bosse 2009, 219–220).

У 1999–2000 гадах адбылася серыя выкраданняў і знікненняў вядучых грамадскіх дзеячоў, якія больш не жадалі працаваць з Лукашэнкам, у тым ліку намесніка старшыні былога Вярхоўнага Савета Віктара Ганчара (кіраўніка выбарчай кампаніі Лукашэнкі на прэзідэнцкіх выбарах 1994 года), бізнэсоўца Анатоля Красоўскага, былога асабістага аператара Лукашэнкі Дзмітрыя Завадскага, а таксама былога міністра ўнутраных спраў, генерала Юр’я Захаранкі (гл. Грамадзянская ініцыятыва “Мы памятаем” – 2011).

Гэтыя падзеі ніколі не былі расследаваныя ці раскрытыя, нягледзячы на пастаянныя запыты з боку як апазіцыі, так і еўрапейцаў. У далейшым асноўныя кантакты паміж ЕС і Беларуссю адбываліся праз пасольствы і офіс TACIC у Мінску, а таксама ўскосна праз офіс АБСЕ на чале з Гансам-Георгам Вікам, былым заходнегерманскім паслом у СССР. Дачыненні з Вікам сапсаваліся праз ролю, якую той адыграў у спробах дыялогу паміж уладамі і апазіцыяй, ды праз ягоны ўдзел у падштурхоўванні апазіцыйных партыяў да абрання адзінага кандыдата (прафсаюзнага лідара Ўладзіміра Ганчарыка) на прэзідэнцкіх выбарах 2001 года.

У выніку Віку было адмоўлена ў новай візе, і пасля ягонага ад’езду пасада заставалася нейкі час незанятая. Пазней, пасля падпісання Мемарандума аб узаемаразуменні паміж АБСЕ і ўрадам Беларусі 1 студзеня 2003 года, Офіс адыгрываў ужо меншую ролю ў беларускім палітычным жыцці. Офіс існаваў, пакуль Беларусь рэзка не спыніла місію АБСЕ пасля выбараў 2010 года (Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, Офіс у Мінску). Пасля пашырэння ЕС у 2004 годзе Офіс TACIC (Тэхнічная дапамога краінам СНД) быў павялічаны і ператвораны ў Дэлегацыю ЕС.

Прэзідэнцкія выбары і 2006 і 2010 гадоў скончыліся масавымі арыштамі і пазбаўленнем волі альтэрнатыўных кандыдатаў, а таксама дзясяткаў іншых людзей. Тым не менш менавіта гэтыя выбары вызначылі будучае развіццё дачыненняў паміж Беларуссю і ЕС. Яны далі пачатак перыяду, у часе якога аўтарытарны рэжым, які існаваў з лета 1994 года, мусіў адкрыцца, прынамсі часткова.

У лістападзе 2006 года, у адказ на арышты палітычных актывістаў, якія мелі месца пасля выбараў, ЕС высунуў 12 умоваў супрацоўніцтва з Беларуссю, выпусціўшы "неафіцыйны дакумент" пад назвай "Што Еўрапейскі Саюз можа даць Беларусі". У ім сцвярджалася, што краіна магла б атрымліваць аналагічныя выгады, як і яе суседзі, Латвія, Літва і Польшча, што далучыліся да Саюза двума гадамі раней. Беларускі народ, маўляў, мог бы атрымаць магчымасць палепшыць якасць свайго жыцця, а таксама спрошчаныя ўмовы для падарожжаў у ЕС. Былі таксама прапановы па паляпшэнні прыгранічнага супрацоўніцтва, падтрымцы ЕС для развіцця малых і сярэдніх прадпрыемстваў і ўмацавання аховы здароўя і адукацыі. Іншыя галіны прапаноўванай супольнай працы ўлучалі ахову навакольнага асяроддзя, стандарты бяспекі прадуктаў харчавання, умовы працы і мадэрнізацыю транспартнай і энергетычных сетак. Беларускія студэнты павінны былі атрымаць больш магчымасцяў для навучання ва ўніверсітэтах краін ЕС, а беларуская эканоміка магла б выйграць, атрымаўшы большы доступ да прыблізна 480 мільёнаў спажыўцоў у Еўропе. Нарэшце, самае важнае – ЕС прапаноўваў павялічыць фінансавую дапамогу свайму партнёру (European Union External Action Service 2006).

У неафіцыйным дакуменце, аднак, адзначалася, што палітыка Лукашэнкі не дазваляе такога ўдзелу краіны ў супрацоўніцтве з ЕС, бо яна адмаўляе беларускім грамадзянам у іх асноўных дэмакратычных правах. Дзеля ўдзелу дакумент прадугледжваў папярэдняе выкананне дванаццаці ўмоваў (European Union External Action Service):

1. Правядзенне дэмакратычных выбараў, у тым ліку забеспячэнне права апазіцыйных кандыдатаў свабодна праводзіць выбарчую кампанію.
2. Забеспячэнне свабоды выказвання і права журналістаў ажыццяўляць сваю дзейнасць, не сутыкаючыся з пераследам.
3. Поўныя правы для НДА.
4. Вызваленне ўсіх палітычных зняволеных, у тым ліку прадстаўнікоў апазіцыйных партыяў і няўрадавых арганізацыяў ды іншых асобаў, арыштаваных падчас публічных дэманстрацыяў.
5. Перагляд справаў палітычных дзяржаўных дзеячоў, якія "зніклі" ў 1999–2000 гадах (Захаранка, Ганчар, Красоўскі і Завадскі).

6. Бесстаронняя і незалежная судовая сістэма.

7. Заканчэнне адвольных арыштаў і змяшчэнняў пад варту.

8. Поўныя правы для нацыянальных меншасцяў.

9. Правы рабочых, у тым ліку права на ўступленне ў (незалежны) прафсаюз.

10. Поўныя правы для прадпрымальнікаў, што дазволяць ім працаваць без перашкодаў.

11. Адмена смяротнага пакарання ў хаўрусе з іншымі краінамі Еўропы.

12. Прыняццё падтрымкі з боку АБСЕ, ЕС і іншых установаў, гатовых аказаць дапамогу Беларусі ды падтрымаць забеспячэнне правоў людзей.

Што да памкненняў ЕС, дык сітуацыя ў дачыненнях з Беларуссю, здавалася, палепшылася да 2008 года з вызваленнем перад парламенцкімі выбарамі большасці палітычных зняволеных – у першую чаргу былога кандыдата ў прэзідэнты і былога рэктара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Ўладзіміра Казуліна. Таму 13 кастрычніка 2008 года міністры замежных спраў 27 краінаў – чальцоў ЕС сустрэліся ў Люксембургу і пастанавілі зняць забарону на паездкі ўсіх, акрамя пяці, чальцоў адміністрацыі Лукашэнкі на 6-месячны выпрабавальны тэрмін (Cassatas 2008)[1].

Нягледзячы на тое, што афіцыйныя паведамленні канкрэтна пра тое не гаварылі, расійская вайна з Грузіяй была адным з імаверных каталізатараў руху да заканчэння астракізму Беларусі. Зрэшты, з другога боку, такія захады з’яўляюцца натуральным працягам ранейшых еўрапейскіх планаў. ЕС таксама перагледзеў свае першапачатковыя 12 пунктаў, якія былі непрымальныя для мінскіх уладаў і не атрымалі шырокага распаўсюджання сярод беларускай грамадскасці. Цяпер Еўрасаюз засяродзіўся на трох асноўных з іх, што ўлучалі дэмакратычныя выбары, свабодныя СМІ, свабоду сходаў і палітычных аб’яднанняў.

Такая “саступка”, на думку, прынамсі, аднаго з назіральнікаў, указвала на пэўную непаслядоўнасць пазіцыі ЕС (Lisichonak 2012). Рэжыму Лукашэнкі яна паказала, што ёсць магчымасці для манеўру ў дачыненні да патрабаванняў ЕС і яны могуць грунтавацца на перамовах паміж двума бакамі. Пазней гэтая канцэпцыя “перамоваў” па розных пунктах была відавочная ў афіцыйнай пазіцыі Беларусі. З пункту гледжання ЕС, магчымая сувязь з вайной у Грузіі сведчыла пра існаванне геастратэгічных і эканамічных прычын для відавочнага збліжэння з рэжымам Лукашэнкі. Такім чынам, было спадзяванне, што, як Украіну ды Грузію, можна прыцягнуць у еўрапейскую супольнасць

---

[1] Выключэннямі былі Лідзія Ярмошына, старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі; Уладзімір Навумаў, міністр унутраных спраў; Дзмітры Паўлічэнка, былы камандзір сілаў спецыяльнага прызначэння МУС; Віктар Шэйман, былы сакратар Рады бяспекі; Юры Сівакоў, міністр спорту і турызму.

і беларусаў. Фонам у гэты час нязменна выступала пытанне пра ролю Беларусі як канала транспартавання расійскага газу і нафты спажыўцам у ЕС па нафтаправодзе "Дружба", на долю якога прыпадала каля 25 % паставак (большасць паставак ішла праз Украіну).

Беларусь была запрошаная стаць чальцом рэгіянальнай ініцыятывы Еўрапейскай палітыкі суседства пад эгідай Еўрапейскай камісіі. Ініцыятыва атрымала назву Ўсходняга партнёрства, а яе ўстаноўчы сход адбыўся ў Празе ў траўні 2009 года. Крытэры таго, што апісваецца як "прывілеяваныя" дачыненні з ЕС, былі тыя самыя, як і ў ЕПС, гэта значыць дзяржава-партнёрка забяспечвае добрае ўрадавае кіраванне ў імкненні да дэмакратыі, правоў чалавека і вяршэнства закону, а таксама ўводзіць рынкавыя прынцыпы ў сваёй эканоміцы.

Краінам, якія, як меркавалася, дасягнулі добрых вынікаў у гэтых галінах, было прапанавана прыняць двухбаковы план дзеянняў з праграмай эканамічных і палітычных рэформаў на трох-пяцігадовы перыяд. Беларусь не дасягнула гэтага этапу ў 2009 годзе і на момант напісання артыкула засталася адзінай еўрапейскай краінай у рамках ЕПС, якая не прыняла супольнага плану (нягледзячы на абмеркаванне сумеснага часовага плану дзеянняў) (European Commission 2011). Іншымі партнёрамі Ўсходняга партнёрства з'яўляюцца Арменія, Азербайджан, Грузія, Малдова і Ўкраіна. ЕС пагадзіўся падтрымаць УП вылучэннем фінансавых сродкаў у аб'ёме 2,6 млрд даляраў ЗША на двухбаковыя і рэгіянальныя праграмы. У студзені 2010 года ЕС абвесціў пра намер замяніць першапачатковыя Пагадненні аб партнёрстве і супрацоўніцтве (ППС) новымі Дамовамі аб асацыяцыі (ДА) (EU Council Secretariat 2011, 1–2).

## Прэзідэнцкія выбары 2010 года ў Беларусі

Прэзідэнцкая выбарчая кампанія 2010 года і яе наступствы сталі крытычным паваротным момантам у дачыненнях краіны з ЕС. Гэтыя падзеі суправаджаліся бурнымі спрэчкамі з Расіяй (якія скончыліся 9 снежня пасля сустрэчы паміж прэзідэнтамі ў Маскве) і заклікамі еўрапейцаў да Лукашэнкі правесці больш дэмакратычную кампанію, чым у мінулым. У лістападзе два міністры замежных спраў ЕС наведалі Мінск – Гіда Вэстэрвэле ад Германіі і Радаслаў Сікорскі ад Польшчы. Яны правялі сустрэчу з беларускім лідарам, у часе якой ён быў паінфармаваны, што, калі выбары будуць праведзены сумленна, яны паспрабуюць паспрыяць вылучэнню крэдыту ў памеры 4,3 млрд даляраў ЗША ад ЕС пры спрыянні Міжнароднага валютнага фонду (МВФ) (Center for European Policy Analysis and Freedom House 2011, 10).

Сярод непасрэдных суседзяў з ліку краінаў Еўрасаюза Лукашэнка таксама атрымаў падтрымку ад прэзідэнта Літвы Далі Грыбаўскайтэ. Яна выказала сваё асабістае меркаванне, што вяртанне Лукашэнкі на пасаду будзе найбольш пажаданым вынікам як найлепшая гарантыя стабільнасці (Charter'97, 2010). Кандыдатаў не бракавала: першапачаткова Цэнтральная выбарчая камісія зарэгістравала 19 чалавек. Але толькі адзінаццаць з іх сабралі неабходны мінімум – 100 000 подпісаў. Адзін – Сяргей Гайдукевіч, лідар Ліберальна-дэмакратычнай партыі, – вырашыў выйсці з гульні, адзначыўшы, што "выбары ў Беларусі – гэта шоў і яго вынікі вядомыя ўжо даўно" (Pulsha 2010).

Еўрапейскія надзеі на тое, што выбары будуць праведзеныя больш справядліва, у пэўнай ступені спраўдзіліся ў тым, што апазіцыйныя кандыдаты мелі магчымасць весці свае кампаніі больш свабодна, чым у мінулым. Кандыдатаў падзялілі некалькі тэмаў. Па-першае, пытанне аб стаўленні да Расіі і неабходнасці спробаў скарыстацца відавочным разрывам паміж Лукашэнкам і ягоным візаві Мядзведзевым ды прэм'ер-міністрам Расіі Ўладзімірам Пуціным. У той час як некаторыя кандыдаты адкрыта спрабавалі знайсці падтрымку ў Расіі – ніводзін не дамогся поспеху, – іншыя лічылі такія крокі непатрыятычнымі і контрпрадуктыўнымі. Па-другое, у той час як некаторыя кандыдаты ад апазіцыі былі арыентаваныя ў першую чаргу на ЕС – Андрэй Саннікаў, Алесь Міхалевіч, а найбольш выразным прадстаўніком гэтай групы быў Рыгор Кастусёў, – яны былі відавочна раздражнёныя нібыта заключаным "гешэфтам" паміж лідарамі ЕС і Лукашэнкам. Для многіх з іх самое існаванне Ўсходняга партнёрства было знакам, што іх абышлі, і еўрапейцы палічылі больш мэтазгодным мець справу наўпрост з урадам.

Беларускі лідар таксама спрыяў узнікненню такога ўражання, робячы грэблівыя заўвагі пра лідараў апазіцыі і адмаўляючыся дыскутаваць з імі на тэлебачанні. Па-трэцяе, кандыдатаў было проста зашмат, каб выбарнікі маглі іх належным чынам успрымаць. Нават пасля публікацыі платформаў у сродках масавай інфармацыі было цяжка адрозніць іх адзін ад аднаго, затое Лукашэнку было надта лёгка абыходзіцца з імі гуртам. На самой справе ён збэсціў іх усіх за змаганне паміж сабой за замежныя гранты, маючы на ўвазе, што яны не здольныя з'яднацца вакол двух-трох кандыдатаў (Волянюк 2010b).

Беларускі электарат памятаў выбары 2006 года і абранне "адзінага" кандыдата Аляксандра Мілінкевіча ў якасці прадстаўніка Аб'яднаных дэмакратычных сілаў. Але 17 верасня 2010 года Мілінкевіч, самы вядомы лідар апазіцыі і лідар Руху "За свабоду", вырашыў не балатавацца на снежаньскіх выбарах (European People's Party Group in the European Parlia-

ment website 2010)[2]. Ён патлумачыў гэта тым, што ўрад адмовіўся змяніць выбарчае заканадаўства, каб дазволіць свабоднае і справядлівае спаборніцтва, але таксама магчыма, што ён выйшаў з гульні праз адсутнасць падтрымкі донараў (Сайт Аляксандра Мілінкевіча). Яго сыход зрабіў карціну яшчэ больш заблытанай, асабліва з пункту гледжання засяроджання грамадскай увагі.

Узнікла мноства альтэрнатыўных кандыдатаў, якое збівала з панталыку, – ад былога намесніка міністра замежных спраў Саннікава, былога старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі [лідара кампаніі “Гавары праўду”] Уладзіміра Някляева ды лідара Партыі зялёных Юр’я Глушакова да выпрабаванага ветэрана беларускай палітыкі Мікалая Статкевіча з Сацыял-дэмакратычнай партыі, Рыгора Кастусёва з Партыі Беларускага Народнага Фронту, эканаміста Яраслава Раманчука і маладых палітыкаў, як Алесь Міхалевіч і Віталь Рымашэўскі, сустаршыня незарэгістраванай Беларускай хрысціянска-дэмакратычнай партыі (гл. Marples and Padhol 2010).

Лукашэнка не браў актыўнага ўдзелу ў кампаніі, але паказваўся на тэлебачанні ў рамках афіцыйных сустрэчаў або разам з замежнымі знакамітасцямі. Карацей, ён стараўся стварыць уражанне занятасці рашэннем дзяржаўных справаў. Напярэдадні выбараў адзін назіральнік пранікліва падсумаваў сітуацыю наступным чынам: “кожны хацеў бы пераменаў, але ніхто не верыць, што ён / яна асабіста мае магчымасць зрабіць значны ўплыў на падзеі або што выбары прынясуць яму перамены” (Шумченко 2010). Чаму за добра падрыхтаванай кампаніяй Лукашэнкі паследавалі пасля-выбарныя рэпрэсіі, застаецца пытаннем гіпатэтычных развагаў і абмеркавання, як і прычыны яго ранейшага палітычнага курсу на больш цеснае супрацоўніцтва з ЕС, калі не браць пад увагу тое, што яно супала па часе з ускладненнем дачыненняў з Масквой. Гвалтоўная рэакцыя АМАПа на дэманстрацыю на плошчы Незалежнасці мела месца пасля таго, як АМАП адбіў відавочную спробу ўварвацца ў будынак парламента (гл. Вашкевич 2010). Да канца ночы больш за 700 чалавек былі арыштаваныя, многія пасля збіцця дубінкамі (Шумченко 2010).

Някляеў быў затрыманы і збіты нават да таго, як дабраўся да самога месца збору на Кастрычніцкай плошчы. Пазней невядомыя забралі яго з бальнічнага ложка і даставілі ў ізалятар КДБ. Саннікаў таксама быў збіты і арыштаваны. Гэтыя падзеі паказваюць не толькі страх рэжыму перад рэвалюцыяй, але і стараннае папярэдняе планаванне з яго боку. Некаторыя вядомыя актывісты былі арыштаваныя за дзень да выбараў, у тым ліку лідары “Маладога

[2] Мілінкевіч таксама мае вельмі добрую рэпутацыю ў ЕС. У кастрычніку 2006 года Канферэнцыяй старшыняў Еўрапейскага парламента яму была прысвоеная Прэмія Сахарава за свабоду думкі. Раней гэтую прэмію ўручалі, у прыватнасці, Кофі Анану і Нэльсану Мандэлу.

фронту" Зміцер Дашкевіч і Эдуард Лобаў. Некаторыя з затрыманых пасля былі падвергнутыя катаванням (гл. Charles 2011)[3].

У многіх выпадках КДБ настойліва вымагаў прызнанняў і прапаноўваў свабоду ў абмен на супрацоўніцтва супраць меркаваных ворагаў дзяржавы. Раманчук выступіў па тэлебачанні і асудзіў тых, хто пайшоў на Плошчу Незалежнасці, за стварэнне пагрозы для жыцця бязвінных грамадзянаў. І Рыгор Кастусёў, і бізнэсовец Віктар Цярэшчанка падтрымалі ягоную пазіцыю, хоць уласная партыя Раманчука, Аб'яднаная грамадзянская партыя, асудзіла ягоную заяву на сваім ўэб-сайце (United Civil Party 2010).

Тым не менш прычыны для празмернай рэакцыі з боку ўладаў застаюцца няяснымі, асабліва таму, што перамога Лукашэнкі ў самых справядлівых выбарах з 1994 года была відавочна гарантаваная. Адну з версіяў высунуў былы палітвязень Зміцер Бандарэнка, на думку якога, супрацоўнікі КДБ былі ўражаныя маштабамі мітынгу і занепакоеныя намерам апазіцыі весці перамовы з тагачасным прэм'ер-міністрам Сяргеем Сідорскім (Charter'97 2012b).

Дастатковая колькасць выбарчых участкаў палічыла галасы дакладна, каб прадэманстраваць, што Лукашэнка не змог атрымаць выразную большасць, сабраўшы не больш за 40 %, і што ўзровень падтрымкі Саннікава склаў 25–30 %. Такім чынам, павінен быў прайсці другі тур (Charter'97 2012). Беспрэцэдэнтная сітуацыя была б ганьбай для Лукашэнкі і ён сутыкнуўся б з сур'ёзным супернікам. Бандарэнка быў кіраўніком выбарчай кампаніі Саннікава, і такім чынам яго аналіз можа памыляцца, схіляючыся да аптымізму ў пытанні падтрымкі свайго кандыдата. З іншага боку, ад незалежных сацыёлагаў не было аніякіх пацверджанняў таго, што Лукашэнка атрымаў амаль 80 % галасоў – афіцыйна заяўленыя лічбы атрыманых ім галасоў. Гэтаксама заяўленая доля галасоў, атрыманых Саннікавым, – крыху больш за 2 % – здаецца значна заніжанай. Зрэшты, недакладнае паведамленне вынікаў выбараў – звычайная практыка беларускай Цэнтральнай выбарчай камісіі з 2001 года. Магчыма, улады баяліся нейкай спробы апазіцыі захапіць уладу, хоць доказаў таго, што хтосьці з яе лідараў выношваў гэткую задуму, няшмат.

## Еўрапейскі адказ на беларускія выбары

Спатрэбіўся час, каб рэакцыя Еўропы на гвалт і арышты ў цэнтры Мінска выявіла сябе ў поўнай меры, але два міністры, якія заклікалі беларусаў правесці свабодныя і справядлівыя выбары, адрэагавалі без прамаруджання.

[3] На прэс-канферэнцыі Алеся Міхалевіча 28 лютага ён падрабязна распавёў пра розныя формы катаванняў. Яго вызвалілі з умовай супрацоўніцтва з КДБ. Замест таго ён прадставіў маляўнічую карціну ўмоваў у камеры і ўжываных катаванняў. Праз два дні яму ўдалося ўцячы з Беларусі ў Чэшскую Рэспубліку, дзе ён атрымаў палітычны прытулак.

Разам з міністрамі замежных спраў Швецыі і Чэхіі, Карлам Більтам і Карэлам Шварцэнбэргам, Вэстэрвэле і Сікорскі апублікавалі ў “Інтэрнэшнл Геральд Трыб’юн” рэдакцыйны артыкул пад назвай “Лукашэнка прайграў”, у якім заявілі, што мець справу з такім лідарам немагчыма. Яны адзначылі, што абвешчаныя вынікі выбараў “не маюць аніякай дэмакратычнай легітымнасці” і што “Еўропа не бачыла анічога падобнага ўжо шмат гадоў”. Фальсіфікацыі галасавання і паліцэйская агрэсія, дадалі яны, “прымушае перасягнуць тое, што Мілошавіч спрабаваў зрабіць у Сербіі ў 2000 годзе”.

На думку аўтараў артыкула, было б марнаваннем грошай выдаткоўваць іх на далейшае ўзаемадзеянне з беларускім прэзідэнтам. Еўрапейскі Саюз выступае за вяршэнства права, правы чалавека, дэмакратыю і не можа стаяць убаку, калі гэтыя каштоўнасці парушаюцца “ў ягонай частцы свету”. Замест таго каб мець справу з лідарам Беларусі, ЕС павінен “паглыбляць [узаемадзеянне] з дэмакратамі Беларусі”, а таксама з палітыкамі, якія не пагадзіліся з жорсткай палітыкай, якая праводзіцца Лукашэнкам (Bildt, Schwarzenberg and Sikorski 2010). Гэта быў самы моцны дагэтуль выпад на адрас прэзідэнта з боку вядомых палітыкаў ЕС, якія заявілі пра сваё расчараванне.

Рэакцыя з іншых рэгіёнаў Еўропы была больш запаволеная, але не менш просталінейная. Міністр замежных спраў Літвы Аўдронюс Ажубаліс запатрабаваў, каб усе палітычныя зняволеныя былі неадкладна вызваленыя і забяспечаныя медычнай дапамогай. Ён таксама раскрытыкаваў як “непераканаўчую” заяву Мінска, што АБСЕ выканала свой мандат і, такім чынам, місія была спыненая (Ажубаліс сам мусіў заступіць у гэты час на пасаду старшыні). 12 студзеня Кэтрын Эштан, вярхоўны прадстаўнік ЕС па замежных справах і палітыцы бяспекі, сустрэлася з тагачасным міністрам замежных спраў Беларусі Сяргеем Мартынавым у Брусэлі і прыгразіла яму прыняццем “адпаведных захадаў”, калі будуць нейкія прамаруджанні з вызваленнем актывістаў апазіцыі, журналістаў ды іншых асобаў (Rettman 2011a).

Старшыня Еўрапейскага парламента Ежы Бузэк у той самы дзень сустрэўся з некалькімі лідарамі апазіцыі і паведаміў ім пра запланаваныя змяненні ў палітыцы ды цвёрдай салідарнасці еўрапейцаў з беларускім народам. Ён параўнаў сітуацыю ў Беларусі з дзейнасцю прафсаюза “Салідарнасць” у Польшчы на пачатку 1980-х ды выказаў упэўненасць, што ў доўгатэрміновай перспектыве тыя, хто выступаюць супраць Лукашэнкі, пераможуць. Ён заявіў, што рэжым у Мінску нелегітымны і што Польшча ўжо адрэагавала на падзеі, падвоіўшы сваю дапамогу беларускай грамадзянскай супольнасці ды НДА з 6,5 да 13 мільёнаў даляраў ЗША. Бузэк адзначыў таксама, што Польшча не дазволіць асобам, адказным за рэпрэсіі, падарожнічаць за межамі Беларусі (RIA Novosti 2011).

7 студзеня 2011 года, праз тры тыдні пасля беларускіх выбараў, паслы краінаў ЕС сустрэліся ў Бруселі і вырашылі скасаваць пастанову аб прыпыненні візавых абмежаванняў, уведзеных упершыню пасля прэзідэнцкіх выбараў 2006 года. У той час забарона датычыла прыблізна 40 чыноўнікаў на чале з Лукашэнкам. Дзеянне забароны было зноў прыпыненае ў кастрычніку 2010 года, хоць іншыя санкцыі засталіся ў дзеянні – пераважна яны датычылі фінансавых актываў тых самых людзей у краінах ЕС.

Была агульная згода, што ў святле рэпрэсіўных дзеянняў беларускіх уладаў неабходна зрабіць моцную заяву. Спіс чыноўнікаў, на якіх пашыралася забарона, быў апублікаваны ў беларускай апазіцыйнай газеце на пачатку лютага ды ўлучаў імёны 158 чалавек (Rettman 2011b). Пазней ён быў пашыраны да 192 імёнаў, куды ўвайшлі некаторыя суддзі і пракуроры, што выносілі прысуды арыштаваным у перыяд пасля выбараў. Здавалася, што кароткі перапынак дыялогу і ўзаемадзеяння скончыўся.

У сваю чаргу, Лукашэнка абвесціў, што Польшча і Германія ажыццявілі шпіёнскія місіі ў Беларусі і што мела месца замежная змова, накіраваная на зрынанне яго рэжыму з дапамогай пятай калоны беларускай апазіцыі (Schwirtz 2011). Беларускія ўлады таксама распачалі сістэматычныя рэпрэсіі супраць апазіцыі і праваабарончых ды няўрадавых арганізацый, якія па сваёй бязлітаснасці не саступалі іншым такім захадам цягам сямнаццаці гадоў знаходжання Лукашэнкі пры ўладзе. Такім чынам, дачыненні паміж ЕС і Беларуссю, як здавалася, дасягнулі новага тупіка.

**Стасункі з Расіяй**

Еўрасаюзаўская палітыка ізаляцыі Беларусі заўсёды рызыкавала падштурхнуць беларусаў у абдымкі Расіі, з якой Беларусь захавала фармальную Саюзную дамову 1997 года. Тым не менш двухбаковыя дачыненні паміж дзвюма дзяржавамі і паміж адпаведнымі прэзідэнтамі перажылі шэраг ваганняў з пачатку 21-га стагоддзя, нягледзячы на падпісанне фармальнага “Саюза” ў красавіку 1997 года ды фармальнае існаванне з гэтага часу Саюзнай дзяржавы. Расія таксама працавала праз іншыя інтэграцыйныя арганізацыі, у якія яна хацела б улучыць Беларусь, у тым ліку праз Еўразійскую эканамічную супольнасць, а таксама ставіла на мэце стварыць супольную эканамічную прастору і ўвесці супольную валюту.

Першапачатковае супрацьстаянне паміж Уладзімірам Пуціным і Аляксандрам Лукашэнкам у 2002 годзе датычыла ўмоваў саюза. Дачыненні пагоршыліся далей, калі Расія вырашыла спыніць субсідаванне паставак газу сваёй суседцы і настойвала – праз кампанію “Газпром” – на тым, што Беларусь

павінна плаціць рынкавую цану. Беларусь, апроч таго, пярэчыла ўвядзенню Расіяй мытаў на свой экспарт нафты праз мяжу (RIA Novosti 2010). Сітуацыя ўскладнілася з пачаткам у 2008 годзе сусветнай рэцэсіі, якая разам з заканчэннем субсідавання з расійскага боку спрычыніла валютны крызіс у Беларусі. Ён застаўся непераадоленым да пачатку 2013 года і прывёў да росту інфляцыі ды дэвальвацыяў нацыянальнай валюты.

Акрамя таго, Беларусь трапіла ў залежнасць ад замежных пазык, якія дазвалялі ёй утрымаць сваю эканоміку на плаву, і гэтая залежнасць аслабіла яе пазіцыі ў дачыненнях з Масквой. Абодва бакі таксама правялі ў чэрвені 2009 года гэтак званую "малочную вайну", калі Расія ўвяла забарону на імпарт беларускай малочнай прадукцыі, вынікам чаго стала адмова Лукашэнкі ад удзелу ў важным саміце Арганізацыі Дамовы аб калектыўнай бяспецы (АДКБ) у Маскве. Увядзенне забароны на імпарт паследавала за адмовай Беларусі ў траўні прыняць 500 мільёнаў даляраў ЗША стабілізацыйнага крэдыту ў расійскіх рублях. Замест таго яна атрымала яшчэ 1 мільярд еўра ў дадатак да ўжо дамоўленага крэдыту МВФ (гл. Silitski 2009). Відавочна, што беларуская палітыка была абумоўленая двума чыннікамі: эканамічнымі праблемамі краіны і двухвектарнай вонкавай палітыкай паміж Захадам (гэтым разам у выглядзе МВФ) і Расіяй.

5 ліпеня 2010 года на Міждзяржаўнай радзе Еўразійскай эканамічнай супольнасці ў Астане Казахстан, Расія і Беларусь дамовіліся пра стварэнне Мытнага саюза. Пры гэтым зона свабоднага гандлю мусіла быць створаная цягам года, а Адзіная эканамічная прастора – да 1 студзеня 2012 года (Волянюк 2010a). Амаль адначасова і бадай не самастойна наважыўшыся на гэта, НТВ паказала ў сваёй праграме "Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне"[4] першую з чатырох серыяў дакументальнага фільма пад назвай "Хросны бацька". Фільм вельмі крытычна разбіраў рэжым Лукашэнкі, абмяркоўваючы выкраданні вядучых дзяржаўных дзеячоў у 1999–2000 гадах і малюючы знішчальны партрэт прыватнага жыцця Лукашэнкі, які жыве асобна ад жонкі ды мае незаконнанароджанага сына, што рэгулярна суправаджае яго ў паездках, а таксама адмоўна каментуючы ягоную негатовасць да супрацоўніцтва ў рамках Саюза Беларусі і Расіі.

Але, здаецца, асабліва раззлавала расійцаў Лукашэнкава адмова прызнаць незалежнасць дзвюх самаабвешчаных рэспублік, якія ўзніклі пасля вайны з Грузіяй, – Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. 3 ліпеня прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў таксама скрытыкаваў адкрыты ліст Лукашэнкі да 80 расійскіх прадпрымальнікаў, што выкладаў беларускі пункт гледжання на працяглы газавы крызіс і ўмовы Мытнага саюза (Бугай 2010). Такім чынам, прыкладна

[4] Фільм стаў 5-серыйным, улетку 2011 года паказалі яшчэ адну серыю. – *Заўв. рэд.*

за пяць месяцаў да выбараў дачыненні з Расіяй, здавалася, дасягнулі новага нізкага ўзроўню. З другога боку, рэзкія словы, здавалася, былі звычайнай з'явай сярод кіраўніцтва постсавецкіх рэспублік. Дачыненні паміж Расіяй і Беларуссю былі напружаныя, але не разарваныя.

Такім чынам, для беларускага кіраўніцтва ў перыяд 2008–2010 гадоў дачыненні з Масквой былі непрадказальныя, і было багата доказаў таго, што расійскія ўлады ахвотна гатовыя дазволіць публічныя нападкі на Лукашэнку ў сваіх тэлевізійных сетках. Тым не менш ізноў жа, што да апошняга, дык ён быў заклапочаны не гэтулькі маральнымі пытаннямі або пераходам да дэмакратыі ці прыватызацыяй, колькі сваёй свабодай манеўру. Карацей кажучы, гэта была сілавая гульня, у якой ён мог пазбегнуць паразы ад сваёй усходняй суседкі толькі саступаючы некаторым запытам Брусэля.

Фінансавая нявыкрутка Беларусі зрабіла таксама некаторыя з яе самых прыбытковых кампаніяў падатлівымі да прапановаў з Масквы. Да канца 2011 года расійская кампанія "Газпром" набыла ў поўную ўласнасць кампанію, адказную за пастаўку расійскага газу ў Еўропу, – "Белтрансгаз". Расійскія кампаніі таксама дасягнулі вялікіх поспехаў у Беларусі ў такіх галінах, як нафтаперапрацоўка, банкаўская справа і страхаванне. Яны вялі перамовы аб зліцці або паглынанні "Беларуськалія" (паводле Лукашэнкі, ён каштуе 30 млрд даляраў ЗША), якога прагне купіць "Уралкалій", найбуйнейшым акцыянерам якога з'яўляецца дагестанскі мільярдэр Сулейман Керымаў (гл. Marples 2011); прадпрыемства па вытворчасці грузавікоў МАЗ і асноўнай кампаніі сотавай сувязі. Міністр фінансаў Расіі Аляксей Кудрын у траўні 2011 года заявіў, што беларускія дзяржаўныя актывы на суму 7,5–9 млрд ЗША павінны стаць даступнымі для набыцця зацікаўленымі з ягонай краіны ў абмен на 3 млрд даляраў ЗША стабілізацыйнага крэдыту, прапанаваныя ачольванай Расіяй Еўразійскай эканамічнай супольнасцю (Ministry of Finance of the Russian Federation 2011). Паводле аднаго з аналізаў, расійцы намерваліся ўзяць пад кантроль "камандныя вышыні эканомікі Беларусі", пасля чаго кіраўнік Беларусі не змог бы працаваць супраць эканамічных інтарэсаў Масквы (Coyle 2011). Прагматычны прэзідэнт ізноў пачаў шукаць магчымасці павярнуць на захад пры ўмове атрымання некаторых стымулаў. Але пасля снежня 2010 года гэты варыянт стаў нерэалістычным.

### Уздзеянне фінансавага крызісу

Далейшыя падзеі ў Беларусі былі азмрочаныя фінансавым крызісам, які паставіў рэжым Лукашэнкі перад самай цяжкай дагэтуль для яго дылемай. Сітуацыя пагоршылася праз падвышэнне заработнай платы для многіх работнікаў ажно на 50 % перад выбарамі 2010 года. Гэта прывяло да змян-

шэння валютных рэзерваў да вельмі нізкага ўзроўню, які, як адзначаецца ў дакладзе МВФ, урад проста не можа сабе дазволіць (International Monetary Fund 2011a).

Урад адказаў на гэта друкаваннем грошай, тым самым выклікаўшы гіперінфляцыю. Цягам 2011 года адбыліся таксама дзве дэвальвацыі, якія прывялі да зніжэння курсу рубля з 2 200 да 8 650 рублёў за даляр (па стане на студзень 2013 года гэты паказнік склаў 8 685 рублёў). Урад таксама спрабаваў атрымаць замежныя крэдыты на суму да 8 млрд даляраў ЗША ад МВФ – гэты запыт усё яшчэ быў у стадыі абмеркавання праз год, у чаканні візіту МВФ у Мінск у кастрычніку 2012 года – і 3 млрд даляраў ЗША з надзвычайнага фонду Еўразійскай эканамічнай супольнасці (як адзначана вышэй). Лукашэнка абвінаваціў у дэвальвацыі Захад, заявіўшы: “Пра якую дэмакратыю мы можам казаць, калі яны выкарыстоўваюць гэты самы момант, калі мы вырашаем праблемы на нашым валютным рынку, каб паспрабаваць нас задушыць” (Agence France Presse 2011). Ён намякаў на тое, што праблемы з атрыманнем крэдыту МВФ былі звязаныя з працягам утрымання палітычных зняволеных у Беларусі. Тым не менш упартасць МВФ здаецца заснаванай больш на нездавальняльнай макраэканамічнай палітыцы Беларусі і адсутнасці эканамічных рэформаў (International Monetary Fund 2011b).

У кастрычніку 2011 года ў Беларусь прыбыла місія МВФ пад кіраўніцтвам Крыса Джэрвіса, якая рэкамендавала Нацыянальнаму банку павялічыць працэнтныя стаўкі, каб знізіць тэмпы інфляцыі. Яна таксама прапанавала дзяржаве спыніць любое далейшае падвышэнне заробкаў і абмежаваць выдаткі. МВФ разам з тым ухваліў уніфікацыю Нацыянальным банкам курсу валюты на ўзроўні рынкавага і плавальны курс рубля (IMF 2011b). У гэты ж час у Мінску было праведзенае мерапрыемства, якое атрымала назву першага тэхнічнага дыялогу ЕС і Беларусі па эканамічных і фінансавых пытаннях. Яно датычыла макраэканамічных і структурных рэформаў у Беларусі, а яго рэкамендацыі істотна не адрозніваліся ад парадаў МВФ.

Пасля таго ўрад Беларусі пад кіраўніцтвам прэм’ер-міністра Міхаіла Мясніковіча распрацаваў фіскальна строгую праграму стымулявання экспарту і кантролю выдаткаў, але першыя паведамленні сведчылі, што яна не была ўхваленая прэзідэнтам, без чаго яна не можа ўступіць у сілу (European Commission 2011 і гл. Kudrytski 2011). Была таксама ўхваленая паступовая прыватызацыя прадпрыемстваў, хоць і значна больш павольнымі тэмпамі, чым прапаноўваў спярша расійскі бок. У сакавіку 2012 года прэзідэнт заявіў, што ў прынцыпе любое прадпрыемства можа быць прададзена, але ў Беларусі не будзе “павальнай прыватызацыі”. З другога боку, ён адхіліў прапанову аб стварэнні рэестра асаблівых “стратэгічных” кампаній, адзначыўшы, што

гэты тэрмін калісьці выкарыстоўваўся да прадпрыемства “Белтрансгаз”, якое тым не менш урэшце прадалі Расіі (Крят 2012). Лукашэнка таксама абвесціў пазней у тым жа месяцы, што ён гатовы прадаць самую прыбытковую кампанію ў краіне, “Беларуськалій”, але за 30 млрд даляраў ЗША, а не 15 млрд даляраў ЗША, якія сёй-той (Уральская калійная кампанія) быў гатовы пакласці на стол (афіцыйны кошт з тых часоў павялічыўся прыкладна да 36 млрд даляраў ЗША). У Беларусі ёсць шмат прыбытковых кампаніяў, працягваў ён, але яны не будуць прададзеныя затанна (National Legal Portal of the Republic of Belarus 2012). Праўда, эканамічная сітуацыя паказвае, што такі продаж будзе працягвацца, а галоўнымі пакупнікамі будуць расійскія кампаніі праз пасярэдніцтва Еўразійскай эканамічнай супольнасці, бо, як і прапаноўваў былы міністр фінансаў Кудрын, продажы будуць звязаныя з крэдытам ЕўрАзЭс.

### Прабіваючы мур ізаляцыі

Падчас фінансавага крызісу 2009–2011 гадоў беларускі прэзідэнт зноў пачаў рабіць некаторыя крокі насустрач еўрапейцам, мабыць занепакоены далейшымі перамовамі з Масквой, у прыватнасці па пытанні аб цэнах на імпартаваны з Расіі газ у 2012 годзе. Дзейнае 5-гадовае пагадненне з Расіяй аб цане на газ скончылася 31 снежня 2011 года, праўда ў канчатковым выніку абодва бакі заключылі палюбоўнае пагадненне[5].

Пры гэтым яму досыць лёгка ўдалося прабіць створаную еўрапейцамі даволі тонкую сцяну ізаляцыі, магчыма, праз заклапочанасць ЕС сваімі ўласнымі фінансавымі праблемамі ды адсутнасць адзінства наконт правільнага падыходу да Беларусі. Дзве падзеі асабліва адметныя, бо паказваюць на існаванне цэлага шэрагу каналаў для камунікацыі па-за межамі афіцыйнай дыпламатыі.

У канцы жніўня 2011 года Мікалай Младзенаў, міністр замежных спраў Балгарыі, пазбягаючы грамадскай агалоскі, нечакана з’явіўся ў Мінску і правёў сустрэчу з Лукашэнкам. Пасля гэтага Младзенаў напісаў ліст Кэтрын Эштан, у якім заявіў, што беларускі лідар намерваецца выпусціць чатырох палітычных зняволеных зараз жа, а рэшту – да 1 кастрычніка. Паведамлялася таксама, што Лукашэнка хацеў правесці круглы стол з лідарамі ЕС і Расіі з нагоды фінансавага крызісу. Да 1 верасня трынаццаць з дваццаці васьмі прызнаных палітычных зняволеных былі вызваленыя, пераважна гэта былі маладыя актывісты (Radio Liberty 2011).[6]

[5] 28 лістапада Расія пагадзілася даць Беларусі зніжаныя тарыфы на газ на рэшту 2011 года і абавязалася даць ніжэйшыя тарыфы на 2012 год.

[6] Былы кандыдат у прэзідэнты Дзмітры Вус быў вызвалены 1 кастрычніка 2011 года.

На ініцыятыву Младзенава – яго крок быў, здаецца, прыватнай ініцыятывай, ажыццёўленай без узгаднення з іншымі дзяржавамі – чальцамі ЕС, – Брусель адрэагаваў асцярожна, і гэтую рэакцыю, напэўна, найлепш падсумаваў польскі міністр замежных спраў Сікорскі. Кіраўнік польскага МЗС адзначыў, што еўрапейцы не збіраюцца ўдзельнічаць у гандлі зняволенымі, а перадумовай для перамоваў з Лукашэнкам было б вызваленне і памілаванне ўсіх палітычных зняволеных (EU Business 2011).

Рэалізуючы такі падыход, беларускі лідар следаваў сваёй ранейшай практыцы з вызваленнем Казуліна, якое стала прэлюдыяй да прыпынення забароны на паездкі ў 2008 годзе і наступнага запрашэння Беларусі далучыцца да Ўсходняга партнёрства. Аднак калі і была тая дамоўленасць вызваліць усіх зняволеных да 1 кастрычніка, дык яна не была выкананая Лукашэнкам. Два кандыдаты ў прэзідэнты, Саннікаў і Статкевіч, засталіся ў турме, гэтаксама як і актывісты "Маладога Фронту" Дашкевіч і Лобаў ды больш за дваццаць іншых асобаў.

Акрамя таго, у жніўні 2011 года беларускія ўлады накіравалі ў літоўскае і польскае міністэрствы юстыцыі запыты на падрабязную інфармацыю пра банкаўскія рахункі арганізацыі "Вясна-96". У выпадку з Літвой дзве краіны з 1993 года мелі прававую базу для перадачы такой інфармацыі ў мэтах узаемнага пераследу злачынцаў. Літоўскі міністр юстыцыі Рэмігіюс Сімясус палічыў запыт руцінным, уважаючы яго падобным да сотняў іншых запытаў, што прыходзяць штогод. На падставе адказаў на запыты, атрыманых ад дзвюх суседніх краінаў – чальцоў ЕС, беларускі бок арыштаваў 4 жніўня лідара "Вясны-96" Алеся Бяляцкага па абвінавачанні ва ўхіленні ад выплаты падаткаў. На судзе ў Мінску ён атрымаў пакаранне ў выглядзе чатырох з паловай гадоў пазбаўлення волі. Бяляцкага, які таксама з'яўляецца намеснікам старшыні Міжнароднай федэрацыі па правах чалавека, можна лічыць бадай самым вядомым і паважаным лідарам праваабарончага руху Беларусі.

Літва, відаць, перадала інфармацыю пра банкаўскія рахункі прыблізна 400 лідараў апазіцыі, а таксама няўрадавых арганізацыяў. І ў Літве, і ў Польшчы былі неадкладна праведзеныя ўнутраныя расследаванні таго, якім чынам маглі быць перададзеныя звесткі па запыце Беларусі. Сімясус сцвярджаў, што ягонае міністэрства не ведала імёнаў "знакамітых людзей" Беларусі і не мела намеру нашкодзіць дэмакратычнай апазіцыі. Польшча таксама пачала ўнутраную праверку. Міністр замежных спраў Сікорскі накіраваў прабачэнні "беларускім дэмакратам ад імя Польскай Рэспублікі на Твітэры" (Marples 2011). Гэтыя інцыдэнты паказалі, што ёсць некалькі шляхоў камунікацыі паміж Беларуссю і яе еўрапейскімі суседзямі, што суседзі-чальцы ЕС маглі міжволі падарваць пазіцыі НДА. Зноў жа з пункту гледжання Мінска такія шчыліны дэманстравалі слабасць і няўзгодненасць у рамках ЕС.

### Варшаўскі саміт Усходняга Партнёрства ЕС

Іншыя неадназначныя сігналы ад Еўропы былі адзначаныя падчас саміту Ўсходняга партнёрства ЕС у Варшаве 29–30 верасня 2011 года. На прэс-канферэнцыі польскі прэм'ер-міністр Дональд Туск заявіў, што Беларусь магла б мець права на атрыманне дапамогі ў памеры да 9 млрд даляраў ЗША, калі б улады вызвалілі палітычных зняволеных і правялі свабодныя выбары. Грошы былі б вылучаныя ў выглядзе крэдытаў ад двух еўрапейскіх банкаў, Еўрапейскага інвестыцыйнага банка і Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця, а таксама МВФ. Лукашэнка мог бы застацца на сваёй пасадзе, калі б стаў пераможцам на свабодных выбарах (Rettman 2011b).

Беларускія ўлады паставіліся да гэтай прапановы з асцярожнасцю. Калі забарона на замежныя паездкі для Лукашэнкі зрабіла немагчымым ягоны ўдзел у саміце, ЕС запрасіў міністра замежных спраў Сяргея Мартынава. Беларускі бок замест гэтага прызначыў кіраўніком сваёй дэлегацыі Віктара Гайсёнка, пасла Беларусі ў Польшчы. Еўрапейцы былі, відавочна, раздражнёныя гэтым рашэннем і адмовіліся запрасіць пасла на вячэру ў рамках саміту, бо на яе былі запрошаныя кіраўнікі дзяржаваў і ўрадаў, пасля чаго беларускае МЗС заявіла, што Беларусь пастанавіла пакінуць паседжанне (Preiherman 2011)[7].

Пры адсутнасці Беларусі дзяржавы – удзельніцы УП выступілі з супольнай заявай аб прагрэсе УП, але адмовіліся падпісаць Дэкларацыю аб сітуацыі ў Беларусі, з якой выступіла кіраўніцтва ЕС. Гэтая заява абвяшчала:

"Кіраўнікі дзяржаваў і ўрадаў і прадстаўнікі ЕС і яго дзяржаваў-чальцоў выказваюць сваю глыбокую заклапочанасць у сувязі з пагаршэннем сітуацыі з правамі чалавека, дэмакратыяй і вяршэнствам закону ў Беларусі, асуджаюць працяг тэндэнцыі да пагаршэння стану свабоды СМІ ў Беларусі і заклікаюць да неадкладнага вызвалення і поўнай рэабілітацыі ўсіх палітвязняў, спынення рэпрэсіяў супраць грамадзянскай супольнасці і сродкаў масавай інфармацыі ды да пачатку палітычнага дыялогу з апазіцыяй. Акрамя таго, ЕС глыбока занепакоены паведамленнямі пра тое, што зняволеныя пазбаўленыя доступу да сваіх сем'яў і адвакатаў, а таксама да медычнай дапамогі і ў той жа час на іх чыніцца псіхалагічны і фізічны ціск (Council of the European Union 2011).

У дзяржаваў – чальцоў УП, відавочна, былі розныя праблемы. У прыватнасці, прэзідэнт Грузіі Міхаіл Саакашвілі падтрымліваў цесныя стасункі з Лукашэнкам, заснаваныя ў значнай ступені на рашэнні апошняга не прызнаваць афіцыйна Паўднёвай Асеціі і Абхазіі. Азербайджан, які быў яшчэ адной краінай, што найбольш рашуча выступіла супраць падпісання заявы ЕС, знаходзіцца ў аналагічнай сітуацыі, як і Беларусь, у тым, што датычыць

[7] Гэтае апісанне падзеяў грунтуецца на расповедзе Яўгенія Прэйгермана.

парушэння правоў чалавека, ды не жадае, каб нейкую краіну – удзельніцу УП ушчувалі такім чынам. Тры іншыя краіны, відавочна, былі больш нешматслоўныя, але ўсё ж адмовіліся падпісаць Дэкларацыю.

Ці азначае гэтая параўнальная паблажлівасць у дачыненні да іншых чальцоў Усходняга партнёрства двухсэнсоўнасць палітыкі ЕС? Ці не завостра зрэагаваў ЕС на сітуацыю ў Беларусі? Адказы на гэтыя пытанні зусім не простыя. Кіраўніцтва ў Беларусі не мянялася з 1994 года і ў параўнанні з некаторымі іншымі дзяржавамі здавалася параўнальна стабільным. Еўрапейцы тым не менш спадзяваліся да 2011 года займець некаторыя рычагі ўплыву і супрацоўніцтва з урадам у Мінску ў кірунку прасоўвання дэмакратыі. Аднак пасля выбараў 2010 года і, напэўна, нават больш у наступныя месяцы рэжым Лукашэнкі зноў устрымаўся ад рэагавання на патрабаванні ЕС, нягледзячы на час ад часу абнадзейлівую рыторыку Мінска. Карацей кажучы, еўрапейцы прыйшлі да высновы, што ў канчатковым выніку ў Беларусі нічога не зменіцца, пакуль Лукашэнка застаецца прэзідэнтам, дый выбралі палітыку пашырэння санкцыяў на ўрадавым узроўні, прапаноўваючы адначасова стымулы для больш нізкага ўзроўню ўзаемадзеяння ды абяцаючы падтрымку апазіцыйным групам.

### Ад'езд паслоў ЕС

Іншая звадка на дыпламатычным узроўні паміж ЕС і Беларуссю здарылася ў канцы лютага 2012 года. Пасля падаўжэння забароны на паездкі для 21 беларускага чыноўніка (пераважна міліцыянтаў і суддзяў) беларускія ўлады прапанавалі паслу Польшчы і кіраўніку дэлегацыі ЕС вярнуцца ў свае сталіцы для кансультацыяў. У адказ на гэта кіраўнічка вонкавай палітыкі ЕС Кэтрын Эштан склікала нараду паслоў дзяржаваў-чальцоў, якія вырашылі адклікаць усіх паслоў краінаў ЕС у Мінску "ў знак салідарнасці і адзінства" (Korovenkova 2010).

Беларускі бок адказаў абмежаваннем выезду за мяжу групы лідараў апазіцыі, якія выказаліся ў падтрымку санкцыяў. Пашырэнне санкцыяў улучала ў сябе далейшае пашырэнне ўвесну 2012 года спісу асобаў, якім забаронены ўезд у ЕС, куды патрапілі яшчэ больш за семдзесят суддзяў розных беларускіх судоў (BelTA 2012a). Колькасць чыноўнікаў у спісе асобаў, якім забаронены ўезд у ЕС, да сакавіка 2012 года склала каля 230 чалавек. Забарона на ўезд – спрэчны захад, як з прычыны яго абмежаванай эфектыўнасці, так і сродкаў, з дапамогай якіх распрацоўваўся адпаведны спіс – уздымае шэраг пытанняў пра будучыя дачыненні з Беларуссю, якія працягваюць жывіць дыскусію.

Па-першае, пагаршэнне стасункаў на дыпламатычным узроўні можа не замінаць пашырэнню гандлю і сувязям нізкага ўзроўню. Напрыклад, у 2011 годзе, нягледзячы на жорсткую рыторыку з абодвух бакоў, беларускі экспарт у ЕС вырас больш чым удвая, да 15,7 млрд даляраў ЗША, значна палепшыўшы дэфіцыт яе гандлёвага балансу. У 2010 годзе экспарт у ЕС упаў на 18 % (Kudrytski 2012). ЕС, разам з Расіяй, застаецца асноўным гандлёвым партнёрам Беларусі. Гандаль з Расіяй мае, мабыць, больш вырашальнае значэнне, бо ўлучае ў сябе экспарт калійных угнаенняў і нафтапрадуктаў, разам з імпартам нафты і газу, але той факт, што гандаль з ЕС вырас, нягледзячы на складаныя дачыненні паміж Бруселем і Мінскам, дэманструе, што гэтыя стасункі не абмежаваныя толькі адным аспектам.

Калі ЕС пастанавіў улучыць аднаго з беларускіх алігархаў, блізкіх да прэзідэнта, Юр'я Чыжа ў свой чорны спіс, ён адразу сутыкнуўся з пярэчаннямі Славеніі. Гэтая краіна рашуча выступіла супраць такога кроку, як паведамляецца, з тае прычыны, што прыналежная Чыжу Elite Estate Company дала славенскай Riko Group кантракт на будаўніцтва гатэля і іншых будынкаў у Беларусі (Jozwiak and Solash 2013). Магчыма, прыцэл на ўвядзенне санкцыяў супраць магутных алігархаў і дзяржаўных кампаніяў дасць большы плён, чым непасрэдная забарона на ўезд палітычных лідараў і суддзяў, але заўсёды існавала занепакоенасць, што эканамічныя санкцыі пашкодзяць насельніцтву краіны гэтулькі ж, колькі і яе кіраўніцтву.

Па-другое, як паказвае вышэйзгаданы прыклад Славеніі, ЕС не з'яўляецца маналітным і пазіцыі асобных дзяржаваў не абавязкова супадаюць з афіцыйнай пазіцыяй ЕС, якая палягае ў ізаляцыі беларускага рэжыму. Напрыклад, літоўскі міністр транспарту і камунікацыяў Элігіюс Масюліс адзначыў 13 красавіка, што ЕС "павінен імкнуцца дасягнуць зменаў у Беларусі нейкім іншым спосабам, а не тымі сродкамі, якія накіраваныя супраць краінаў ЕС". Ён указаў на тое, што Беларусь экспартуе ўгнаенні і тэхніку праз Клайпедскі порт і спыненне гэтага экспарту азначала б страту даходаў для ўрада Літвы (Belsat 2012). З другога боку, некаторыя рознагалоссі могуць існаваць і ўнутры ўрада Беларусі. І цяперашні прэм'ер-міністр Мясніковіч, і ягоны папярэднік Сяргей Сідорскі, праўдападобна, ухвалілі праграмы эканамічных рэформаў, якія ідуць далей, чым усё, што калісьці прасоўвалася прэзідэнтам, хоць ніякіх прыкметаў існавання якіх-кольвечы альтэрнатыўных Лукашэнкавым платформаў пакуль заўважана не было.

Нарэшце, ізаляцыя і санкцыі не з'яўляюцца эфектыўнымі ў справе дасягнення зменаў у аўтарытарнай дзяржаве, не ў апошнюю чаргу з прычыны ўспрыманага дысбалансу ў абыходжанні з дзяржавамі ў наваколлі ЕС, а таксама адсутнасці відавочнай альтэрнатывы Лукашэнку. Ён усё яшчэ заставаўся

самым папулярным палітыкам у Беларусі ўвесну 2012 года, хоць і ў меншай ступені, чым тое сцвярджаюць афіцыйныя вынікі выбараў.

Ці ёсць правільнай пазіцыя навязвання Еўрапейскім Саюзам сваіх геапалітычных і маральных поглядаў былому савецкаму рэжыму, калі большая частка насельніцтва гэтай краіны задаволеная сваім урадам і ўзроўнем жыцця? Або, з другога боку, як можна асабліва вылучаць Беларусь, калі падобныя або горшыя палітычныя ўмовы ёсць у іншых дзяржавах Усходняга партнёрства або калі на мяжы ЕС ёсць іншыя дзяржавы, якія з’яўляюцца больш карумпаванымі і амаль такімі ж жорсткімі ў сваёй унутранай палітыцы? Акрамя таго, ці можна дасягнуць зменаў праз ізаляцыю? І ці не загоніць проста ізаляцыя Беларусь у абдымкі Расіі? Крытыкі палітыкі ЕС падрабязна абмяркоўвалі гэтыя пытанні. Найбольш заўважнымі былі тэксты аналітыкаў Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Аляксея Пікуліка і Дзяніса Мельянцова. Уважлівае прачытанне аднаго з іхных артыкулаў (сакавік 2012 года), напісанага у адказ на эскалацыю канфлікту з ад’ездам паслоў ЕС, дае прыклад разумнага і аб’ектыўна крытычнага падыходу.

Адзначаючы, што Мінск можа зрабіць далейшыя крокі, яны адзначылі, што падвышаны ціск з боку ЕС, імаверна, будзе мець некалькі наступстваў. Па-першае, беларускі рэжым, відаць, звернецца да новых захадаў з арсеналу “рэпрэсіўнага аўтарытарызму”, уціскаючы палітычныя і грамадзянскія правы, але таксама сігналізуючы пра канчатковую перамогу ўнутры дзяржавы сілаў бяспекі над “умеранымі” сіламі ў палітычнай эліце[8]. Акрамя таго, яны лічаць, што гэта будзе азначаць далейшую дэлегалізацыю і сыход у падполле інстытутаў і структураў незалежнай палітычнай і грамадзянскай супольнасці. Па-трэцяе, гэта прывядзе да страты магчымасцяў інстытуцыйнай і тэхналагічнай мадэрнізацыі беларускай эканомікі за кошт еўрапейскіх інвестыцыяў, а таксама пад уплывам еўрапейскіх каштоўнасцяў, якія гэты працэс мог бы прынесці.

Па-чацвертае, яны баяцца “кубінізацыі” беларускай апазіцыі, частка якой, відаць, пачне працаваць у выгнанні, адначасова трацячы ўплыў на падзеі ў

---

[8] Гэтая тэма выходзіць за межы гэтага артыкула, але рост магутнасці і міжусобіцы ўнутры сіл бяспекі былі прадметам шырокага абмеркавання. Гэтыя сілы знаходзяцца цяпер пад кантролем сына прэзідэнта Віктара Лукашэнкі і падазраюцца ў датычнасці да шэрагу сур’ёзных інцыдэнтаў падчас прэзідэнцтва Лукашэнкі, якія ніколі не былі вычарпальным чынам растлумачаныя. Яны ўлучаюць у сябе знікненні людзей у 1999–2000 гадах, “тэрарыстычныя” напады ў 2006, 2008 гадах і смяротны выбух 11 красавіка 2011 года, калі на станцыі метро “Кастрычніцкая” ў цэнтры Мінска загінулі 12 чалавек і былі параненыя сотні іншых (двое маладых людзей з Віцебскай вобласці былі ў сакавіку 2012 году пакараныя смерцю па абвінавачанні ў падрыве гэтай бомбы), а таксама смерць Алега Бябеніна, заснавальніка сайта Charter’97, 3 верасня 2010 года (абвешчаная следствам прычына смерці – самагубства). Адна з аўтараў адзначыла, што сілы бяспекі стварылі “атмасферу страху” ў беларускім грамадстве: Leshchenko, Natalia (2008). The National Ideology and the Basis of the Lukashenka Regime in Belarus // Europe-Asia Studies. Vol. 60. No. 8. P. 1429.

Беларусі. Усе гэтыя сцэнары ўмацуюць уладу Расіі над Беларуссю і могуць прывесці да страты суверэнітэту дый нават дзяржаўнасці. Далей аўтары пераходзяць да крытыкі таго, што яны ўспрымаюць як пазіцыю “эмацыйнай меншасці”, якая падтрымлівае санкцыі з прычыны пакутаў, перанесеных ёй у выніку “рэпрэсіяў 2010–2011 гадоў”. Гэтая пазіцыя, на іх думку, зразумелая, але памылковая, бо яна не прывядзе да падзення рэжыму (Мельянцов и Пикулик, 2012).

Таму, сцвярджаюць яны, санкцыі непрадуктыўныя і небяспечныя і яны не пойдуць на карысць жыхарам Беларусі. Тое, што ў іх аналізе ёсць доля праўды, відаць з росту кантынгенту беларускіх эмігрантаў, у прыватнасці, у Польшчы і Чэшскай Рэспубліцы. Лагічна, што для ЕС можа быць мэтазгодным трымаць адкрытымі каналы камунікацыі і на вышэйшых, і на ніжэйшых узроўнях беларускага грамадства.

**Расійскі варыянт**

Вяртаючыся да пытання, пастаўленага на пачатку гэтага артыкула, ці будзе Беларусь вымушаная прадаць каштоўныя дзяржаўныя актывы Расіі, трэба адзначыць, што апошнія паведамленні паказваюць, што, хоць Расія, імаверна, будзе ціснуць на Беларусь, грамадская думка ў апошняй краіне, як правіла, выступае супраць продажу кампаній расійскім інвестарам. Паводле праведзенага ў верасні 2012 года Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД) апытання, толькі 10 % рэспандэнтаў лічылі продаж “Белтрансгаза” расійскаму “Газпрому” станоўчым крокам; 30 % разглядалі яго як адмоўную падзею, але меркавалі, што ў Беларусі не было выбару; а 43,3 % меркавалі, што гэтае прадпрыемства ўвогуле нельга было прадаваць. Што да магчымасці продажу “Беларуськалія”, дык толькі 7,6 % ставіліся да гэтага станоўча; 17,5 % – адмоўна, але меркавалі, што гэта прымальна, калі б цана была вельмі высокая; і 58,7 % выказаліся супраць (НИСЭПИ 2012а). Лукашэнка таксама пачаў выказваць трывогу з нагоды прыватызацыі дзяржаўных кампаніяў, падкрэсліваючы, што важныя заводы павінны кантралявацца пераважна дзяржавай (Маненок 2012)[9].

Беларусь таксама моцна залежыць ад экспарту ў фармаванні свайго ВУП, і таму было б нелагічным з фінансавага пункту гледжання прадаваць буйныя кампаніі дзеля кароткатэрміновых выгадаў, якія не могуць быць паўтораныя. Такая сітуацыя можа тлумачыць часта супярэчлівыя рухі прэзідэнта Беларусі, калі ён, здаецца, гатовы і хоча прадаць кампаніі Расіі,

[9] Гэты каментар прагучаў у звязку з нацыяналізацыяй кандытарскіх фабрык “Камунарка” ды “Спартак”.

але пасля або перашкаджае гэтаму, або ўздымае цану вышэй за ацэньваны кошт прадпрыемстваў.

З расійскага пункту гледжання, у Беларусі, праўдападобна, ёсць няшмат рэальных варыянтаў. Паводле некаторых паведамленняў, планы па прыцягненні замежных інвестыцыяў у 2012 годзе не былі выкананыя нават на 20 %. Не чакалася таксама, што місія МВФ у канцы 2012 года завершыцца прапановай Мінску новых крэдытаў[10]. У СМІ цытавалася меркаванне былога старшыні Нацбанка Станіслава Багданкевіча, які лічыў, што планы ўрада па дасягненні росту ВУП у памеры 8,5 % нерэалістычныя, а ўлады нясуць залішнія выдаткі на органы правапарадку (1,23 млрд даляраў ЗША), тады як на транспарт, сельскую гаспадарку, лясную гаспадарку, будаўніцтва і прамысловасць, разам узятыя, асігнуецца толькі 2 млрд даляраў ЗША, а на навуку і даследаванні – усяго 176 млн даляраў ЗША.

Вядуцца перамовы аб продажы кантрольных пакетаў акцыяў розных кампаніяў: нафтаперапрацоўчых заводаў, кампаніі мабільнай тэлефоннай сувязі МТС, прадпрыемства па вытворчасці грузавікоў МАЗ, “Беларуськалія” і нацыянальнай авіякампаніі “Белавія”, хоць пытанне набыцця беларускай паштовай службы (“Белпошта”) расійскай паштовай службай было знята з парадку дня. У кожным разе, галоўным аб’ектам для спрэчак былі цэны. Беларускі бок сцвярджаў, што прапанаваныя расійцамі цэны былі заніжкія. Аўтар лічыць, што Расія мае ўсе карты на гэтых перамовах, бо можа спыніць выдачу крэдытаў, падвысіць цэны на нафту і газ, а таксама зачыніць свае рынкі для розных беларускіх экспартных тавараў, прыкладам малака, мяса і тэкстылю. Акрамя таго, Расія можа падвысіць цэны на газ, бо Беларусь у 2012 годзе мусіла плаціць толькі 160 даляраў ЗША за тысячу кубаметраў у параўнанні з больш як 460 далярамі ЗША, якія плаціла Ўкраіна. Закранаючы пытанне аб продажы нафтаперапрацоўчых заводаў Расіі, Лукашэнка парыраваў, што калі яны будуць прададзеныя, дык Беларусь павінна атрымаць магчымасць узяць удзел у здабычы 10 млн тон нафты і 10 млрд кубаметраў газу ў год з расійскіх радовішчаў (Швейц 2012).

Усе вышэйпрыведзеныя каментары зыходзяць з дапушчэння, што Расія хоча ўскладніць жыццё беларускаму ўраду. Адзін з заходніх аналітыкаў таксама адзначыў, што дэфіцыт гандлёвага балансу Беларусі ў гандлі з Расіяй

[10] Місія МВФ на чале з Дэвідам Гофманам наведала Мінск 19–29 кастрычніка. Паводле першапачатковых паведамленняў, агенцтва накіравала Беларусі сур’ёзнае папярэджанне, што, хоць больш строгая эканамічная палітыка ў 2011 годзе і скараціла інфляцыю ды дала магчымасць стабілізаваць валюту, неабходна прыняць далейшыя тэрміновыя захады: “Тым не менш за першапачатковым поспехам паследавала хуткае зніжэнне стаўкі рэфінансавання і хуткі рост заробкаў у рэальных паказніках. Гэтыя фактары цяпер ізноў вядуць да ўзнікнення ціску на цэны і валютны курс. Дзеля гэтага ціску неабходна прыняць рашучыя і паслядоўныя супрацьдзейныя захады эканамічнай палітыкі, каб утрымаць эканоміку ў стабільным стане”, – адзначыў Дэвід Гофман.

вырас з 8 млрд даляраў ЗША у 2010 годзе да 11 млрд даляраў ЗША у 2011 годзе, нягледзячы на яе чалецтва ў Мытным саюзе з Расіяй і Казахстанам (Іофе 2012). Аднак логіка падказвае, што перавага будзе аддавацца слабому рэжыму ў Мінску, які залежыць ад расійскіх пазыкаў, а не краху Лукашэнкавага кіравання, нягледзячы на ўсе расчараванні ў працы з ім. Найважнейшай асаблівасцю Беларусі з пункту гледжання Масквы ёсць яе геастратэгічнае становішча і статус партнёра-хаўрусніка. Магчыма, менавіта таму Расія адмовілася падтрымаць нейкую палітычную альтэрнатыву Лукашэнку падчас прэзідэнцкіх выбараў 2010 года ў Беларусі, нягледзячы на інтэнсіўныя кансультацыі некаторых кандыдатаў у Маскве, а таксама пагаршэнне стасункаў паміж адпаведнымі кіраўнікамі дзяржаваў у той час.

Таму, як ні парадаксальна, але хоць залежнасць Беларусі ад Расіі і вырасла за гады прэзідэнцтва Лукашэнкі, аднак Масква не можа дыктаваць палітыку Мінску. Яна і не спрабавала тое рабіць, апроч як па канкрэтных пытаннях, як цэны на нафту і газ ці сплочванне даўгоў. Інакш кажучы, Расія дагэтуль ніколі цалкам не выкарыстоўвала свае эканамічныя перавагі, каб паспрабаваць устараніць Лукашэнку. Без расійскіх пазыкаў або крэдытаў ад ачольваных Расіяй структураў, як, напрыклад, Еўразійская эканамічная супольнасць, Беларусь сутыкнулася б з сур'ёзнымі цяжкасцямі. Акрамя таго, цяпер, калі Беларусь уступіла ў Мытны саюз з Расіяй і Казахстанам, яна ўступіла ў партнёрства, якое спрыяе больш цеснай эканамічнай інтэграцыі, асабліва за кошт скарачэння нетарыфных бар'ераў і ўрэшце, відаць, за кошт стварэння наднацыянальных структураў для далейшага супрацоўніцтва (гл. Pyrkalo 2012).

У некаторых дачыненнях кіраўніцтва абедзвюх краінаў – хутчэй за часы прэзідэнцтва Ўладзіміра Пуціна, а не Дзмітрыя Мядзведзева – мае шмат супольнага. Абедзве кіроўныя каманды з'яўляюцца аўтарытарнымі, забяспечваюць моцную ролю органаў бяспекі, асцерагаюцца патэнцыйнай сілы НАТА, і маюць супольнае ды станоўчае бачанне савецкага мінулага ды братэрскіх стасункаў у ім Расіі і Беларусі, асабліва за часы выпрабаванняў, як у "Вялікую Айчынную вайну". (Manaev, Manayeva and Juran 2011, 94–95)[11]. Абедзве працягваюць адзначаць савецкія юбілеі і ў некаторай ступені ўшаноўваюць былых савецкіх лідараў (RT 2012 і гл. Дынько 2010)[12].

[11] Але ў гэтай аналогіі з СССР ёсць абмежаванні. Алег Манаеў, Наталля Манаева і Дзмітры Юран адзначылі паступовы адыход Беларусі ад савецкай спадчыны і той факт, што, у адрозненне ад савецкіх часоў, сёння ў Беларусі – хай сабе і пад ціскам – існуюць шматлікія палітычныя партыі, а таксама некаторыя НДА, незалежныя СМІ, а на долю прыватных кампаніяў прыпадае 25–30 % ВУП.

[12] У кастрычніку 2012 года падчас інтэрв'ю тэлеканалу Russia Today Лукашэнка настойваў, што нельга дэманізаваць Леніна і Сталіна: 'I'm far from a Stalin – Lukashenka', *RT*, 16 October 2012, <http://rt.com/politics/lukashenko-conference-belarus-media-542/>. [accessed 1 November 2012]. У адрозненне ад таго, прэм'ер-міністр Мядзведзеў казаў, што сталінскі рэжым заслугоўвае рэзкага асуджэння за абвяшчэнне вайны супраць уласнага народа.

Гэткія светапоглядныя моманты хаваюць за сабой адрозненні ў рэжымах эканамічнага развіцця і дробныя сваркі, якімі былі прасякнутыя стасункі ў першае дзесяцігоддзе 21-га стагоддзя. Нарэшце, лідары абедзвюх краін адзіныя ў барацьбе супраць заходняга "ўмяшання" па такіх пытаннях, як дэмакратычная паводзіны, правы чалавека і палітычныя зняволеныя. Гэта, прынамсі, забяспечвае ім пэўныя рамкі, разам з больш відавочнымі сувязямі, у прыватнасці фактам быцця абодвух народаў славянскімі суседзямі, якія збольшага размаўляюць на адной мове. Такога кшталту рацыяналізацыя, магчыма, ёсць яшчэ адной прычынай, чаму Расія рэдка калі дасылала ўльтыматумы Беларусі. Іншая прычына палягае ў тым, што Беларусь заўсёды мела і нейкія іншыя варыянты, якімі б цяжкадаступнымі тыя ні падаваліся. Кітайскія крэдыты або новыя пазыкі МВФ, якія прыйшлі б, абумоўленыя рознымі вымогамі, з'яўляюцца двума таму прыкладамі.

**Выснова**

Прынамсі ў кароткатэрміновай перспектыве, рэжым Лукашэнкі будзе здатны выжыць у той ці іншай форме, калі дасць рады здабыць больш кароткатэрміновых крэдытаў, кантраляваць інфляцыю ды стварыць валютныя рэзервы на прымальным узроўні. Прагнозы наконт яго эканамічнага калапсу, здаецца, не пацвярджаюцца бягучай сітуацыяй, якой бы складанай яна ні была. Хоць папулярнасць прэзідэнта на палітычнай арэне крыху знізілася[13], але нідзе не відаць яму лагічнай замены.

Апазіцыя моцна пацярпела ад рэпрэсіяў, а ва ўрадзе няма адкрытых рознагалоссяў, хоць там існуюць рознагалоссі наконт будучага курсу краіны. Рэжым, хутчэй, пераняў абложны менталітэт – прэзідэнт выступіў за стварэнне прыватных войскаў пад камандаваннем абласных губернатараў (BelTA 2011) – гэтая ідэя паследавала за ранейшай рыторыкай пра паўнамоцтвы АДКБ умешвацца ва ўнутраныя крызісы дзяржаваў-чальцоў і законапраектамі, што пашыралі правы і магчымасці КДБ як "дзяржавы ў дзяржаве". Лукашэнка выступіў з публічнымі заявамі, у якіх выказаў сваё абурэнне абыходжаннем да абыходжання НАТА з былым лівійскім лідарам Муамарам Кадафі, якое ён ахарактарызаваў як горшае, чым тое, што рабілі нацысты (ITAR-TASS 2011). Аналогія паміж Лівіяй і Беларуссю, бясспрэчна, надуманая, але ў свядомасці аўтарытарных лідараў і дыктатараў такія страхі – нешта шырока распаўсюджанае.

---

[13] Апытанне, праведзенае ў сакавіку 2012 года Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў, паказала, што рэйтынг прэзідэнта складае каля 34,5 %, у параўнанні з 20,5 % у верасні 2011 года. Але ніводзін з кандыдатаў ад апазіцыі не змог атрымаць рэйтынг, які б дасягаў двухзначных лічбаў, можа быць таму што яны былі ў зняволенні, знаходзіліся пад хатнім арыштам або з'ехалі за мяжу пасля выбараў 2010 года.

Стасункі паміж ЕС і Беларуссю, такім чынам, зайшлі ў тупік, але, хоць Брусель бадай не абавязаны перазапускаць супрацоўніцтва з Мінскам пры любых абставінах, ён усё ж можа задумацца пра розныя альтэрнатывы. З другога боку, ЕС мог бы следаваць курсам, прапанаваным Дэвідам Крэмэрам з “Фрыдам Хаўзу”, гэта значыць курсам поўнай ізаляцыі і адмовы ад супрацоўніцтва з беларускім рэжымам, не пераймаючыся з нагоды магчымага падштурхоўвання Беларусі ў рукі расійцаў (Charter’97 2011).

Сапраўды, калі ЕС адрэагуе на прымірэнчыя ініцыятывы Лукашэнкі, дык яму, магчыма, давядзецца пайсці на кампраміс па розных пытаннях, у тым ліку ў галіне грамадзянскіх правоў і свабодных выбараў. Брусель ужо ўскосна прызнаў тое ў сваёй заяве ў верасні 2011 года, адзначыўшы, што прэзідэнт хутчэй за ўсё застанецца на сваёй пасадзе. Гэта – нялёгкі выбар, і ён становіцца яшчэ цяжэйшым праз заклапочанасць ЕС фінансавымі нягодамі сваіх чальцоў, прыкладам Грэцыі і Італіі.

Санкцыі часам даюць плён, але часцей за ўсё яны з’яўляюцца сімвалічнымі рэпрэсіямі, якія могуць абазначаць апраўданую заклапочанасць наяўнасцю палітычных зняволеных, а не сродкамі ажыццяўлення змены рэжыму ці прасоўвання дэмакратыі. Апошнія аспекты цяпер увогуле не з’яўляюцца рэалістычнымі варыянтамі для ЕС. Замест гэтага ён можа сціпла ўзаемадзейнічаць з беларусамі на некалькіх узроўнях – праз адукацыйны абмен, забеспячэнне бяспекі межаў, гандаль, тэхналогіі і павелічэнне інвестыцыяў, дзе ён можа канкураваць з расійскім капіталам, калі Беларусь пойдзе на прыватызацыю найбуйнейшых кампаній. Такім чынам, ЕС можа захаваць для сябе адкрытымі шэраг варыянтаў, беручы пад увагу тое, што некаторыя з яго чальцоў на межах Беларусі зацікаўленыя ў захаванні пэўнага ўзаемадзеяння на розных узроўнях.

Гэтаксама ў рамках Усходняга партнёрства няма ніякай логікі ў асаблівым вылучэнні Беларусі, калі толькі не дапускаць, што гэтая невялікая постсавецкая дзяржава, пазбаўленая прыродных рэсурсаў, сапраўды можа гладка і беспраблемна рухацца ў бок дэмакратычных пераўтварэнняў. Замест таго каб звязваць сваю будучыню з партнёрствам з Расіяй ці ЕС, беларускае кіраўніцтва заахвочвала пэўны від грамадзянскага нацыяналізму, заснаванага на існаванні незалежнай дзяржавы, а рэжым забяспечваў жыхароў краіны асноўнымі сродкамі існавання ў патэрналісцкім грамадстве на чале з прэзідэнтам, называным “бацькам” (гл. Leshchenko 2008).

Увогуле, беларускія выбарнікі, здаецца, пасіўна задаволеныя статусам-кво і асцерагаюцца таго кшталту рэформаў, якія былі ажыццёўленыя праз шокавую тэрапію ў Расіі. Прэзідэнт часта спасылаецца на перыяд з 1991 да пачатку 1994 года ў Беларусі як час вялікіх нягодаў і росту беднасці, які

скончыўся толькі калі ён заняў пасаду прэзідэнта. Такім жа чынам ён стварыў вобраз дзяржавы, аточанай ворагамі, сярод якіх ён найчасцей называў НАТА і ЗША, але апошнім часам мішэнню быў Еўрапейскі Саюз, што імкнецца навязаць свае прынцыпы іншай суверэннай краіне.

Ці ўяўляе сабой ЕС штосьці жаданае для народа Беларусі або беларусы аддаюць перавагу развіццю без цвёрдай прывязанасці да міжнародных хаўрусаў на ўсходзе ці захадзе? Добра вядома, што грамадскасць рэагуе на пэўныя абяцанні падчас выбарчых кампаніяў, галоўнымі з якіх з'яўляюцца ўстойлівы ўзровень жыцця, забеспячэнне бяспекі і папярэджанне канфліктаў.

На сённяшні дзень прэзідэнт Лукашэнка здолеў забяспечыць большасць гэтых патрабаванняў, хоць і крыху незвычайнымі сродкамі, напрыклад праз перапродаж субсідаванага расійскага імпарту, і нягледзячы на эканамічныя праблемы 2009–2011 гадоў, у тым ліку праз нястрымную інфляцыю. Магчыма, дэмакратыя, свабода выказвання і свабода СМІ не з'яўляюцца ключавымі прыярытэтамі для насельніцтва, хоць гэта не сведчыць і пра наяўнасць вялікай падтрымкі каштоўнасцяў былога Савецкага Саюза, афіцыйных, дзяржаўных СМІ або глыбейшай інтэграцыі з Расіяй.

Некаторыя маладзейшыя беларусы глядзяць у бок Еўропы, але яны расчараваныя шэнгенскімі візавымі зборамі па 60 еўра, якія трэба заплаціць, каб перасекчы мяжу з ЕС, – даўняя праблема, якую можна было б вырашыць прасцей, чым многія іншыя пытанні. Пакуль жа цяперашняя заблытаная сітуацыя мала спрыяе павелічэнню падтрымкі таго ці другога боку, прытым яна не мае таксама істотнай тэндэнцыі да змянення. Гандаль паміж ЕС і Беларуссю і сёння захоўваецца на высокім узроўні, як і ўзаемадзеянне на розных узроўнях, і гэта лагічна, што яны павінны быць працягнутыя.

Казаць, што маленькая краіна з насельніцтвам 9,4 млн чалавек заціснутая паміж дзвюма альтэрнатывамі, будзе, мабыць, празмерным спрашчэннем. Гэта – не прамы выбар паміж Бруселем і Масквой. Дачыненні паміж ЕС і Расіяй усё больш пераплятаюцца паміж сабой. Асобныя краіны ЕС зрабілі сваім прыярытэтам шчыльныя эканамічныя і палітычныя сувязі з Расіяй. Беларусь таксама мае іншыя альтэрнатывы, як тое паказваюць перамовы і гандаль з Кітаем (гл. Charter'97 2012a)[14]. Але яе непасрэднымі суседзямі з'яўляюцца Еўрасаюз і Расія: адзін – магутны эканамічны блок, другая – вайсковая і палітычная сіла ў рэгіёне. Цягам многіх гадоў беларускі прэзідэнт выжываў часткова менавіта аперуючы ў прасторы, якая паўстала паміж імі.

Інакш кажучы, незалежна ад фактычнай наяўнасці ў ЕС і Расіі супрацьлеглых інтарэсаў, Беларусь вызначае іх як два асобныя і супрацьлег-

[14] Я не змог знайсці пацверджанне гэтаму паведамленню або параўнаць яго з іншымі крыніцамі.

лыя сілавыя блокі, якія змагаюцца паміж сабой за лаяльнасць Беларусі. І ў нейкай меры два суседы ўзаемна адпавядаюць гэтаму ўспрыманню: ЕС уводзіць санкцыі пасля беларускіх выбараў, Расія прызнае гэтыя выбары свабоднымі і справядлівымі. І калі Расія аказвае завялікі ціск, беларускія ўлады заўсёды могуць выпусціць найважнейшых палітычных зняволеных, каб атрымаць спрыянне еўрапейцаў. Па сутнасці, гэта палітычная гульня ў карты, але правілы яе былі ўсталяваныя не гэтулькі ў Бруселі і (у меншай ступені) Маскве, колькі ў Мінску. Такім чынам, той, хто здае карты, можа быць самым слабым гульцом, але ён тым не менш па-ранейшаму ў значнай ступені кантралюе гульню, пакуль іншыя гульцы застаюцца за сталом.

Магчыма, што і крытыка палітыкі ЕС перабольшаная. Нягледзячы на цяжкасці ў знаходжанні кансенсусу паміж ягонымі чальцамі, а таксама часткову эфектыўнасць санкцыяў, якія ўжываюцца да асобаў, ёсць некаторыя сведчанні таго, што многія беларусы зацікаўленыя ў ЕС і падтрымліваюць палітыку цесных стасункаў з ім. У выпуску "Навінаў НІСЭПД" за снежань 2012 года, які праводзіць штоквартальныя апытанні ў Беларусі аб стаўленні да Расіі і ЕС, адзначаецца наступнае: выбіраючы паміж аб'яднаннем з Расіяй і ўступамленнем у ЕС, 43,4 % рэспандэнтаў выбралі б першае, і 37,7 % – апошняе (IISEPS 2012b).

З другога боку, у публікацыі адзначаецца, што на глыбейшым узроўні паступовы дрэйф ад Расіі да ЕС станавіўся ўсё больш відавочны, асабліва на ўзроўні перадачы тэхналогіяў і давання крэдытаў. Дрэйф гэты быў менш відавочны ў галіне рэалізацыі рэформаў. Інакш кажучы, еўрапейскі выбар, прынамсі, з'яўляецца канкурэнтаздольным, але магчыма мела некаторы ўплыў афіцыйная прапаганда аб несправядлівасці вонкавых сілаў, якія патрабуюць рэформаў і пераўтварэнняў.

Апытанне азначае, што апублікаваны ў 2007 годзе аналіз Балаша Ярабіка і Алістара Рабальяці быў крыху песімістычны і сёння ў Беларусі існуе большая дасведчанасць наконт ЕС і яго інстытутаў, чым пяць гадоў таму. У гэтым дачыненні, магчыма, варта было б цалкам пераасэнсаваць палітыку ЕС. Магчыма, яна стала ахвярай разумных стратэгічных хадоў хітрага лідара, але ёсць сведчанні таго, што яе ўмераныя палітычныя захады забяспечылі дасягненне паступовага эфекту, як і рашэнне аб ужыванні мякчэйшых санкцыяў, а не санкцыяў, накіраваных на сур'ёзнае эканамічнае ўздзеянне.

Ці можа Беларусь працягнуць сваю палітыку маніпулявання і кантролю палітычнай картачнай гульні? Магчыма, але гэта можа запатрабаваць уступлення ў гульню дадатковых партнёраў, такіх як Кітай, з якім ужо будуецца значнае эканамічнае партнёрства, і ў больш кароткатэрміновай перспектыве саюзныя дзяржавы, як Венесуэла (мяркуецца, што Беларусь можа аднавіць

з гэтай краінай тыя дачыненні, якія яна мела з прэзідэнтам-нябожчыкам Уга Чавесам), што можа зменшыць беларускую залежнасць ад расійскай нафты. З другога боку, яе асноўнымі партнёрамі будуць заставацца Расія і ЕС, і ў абодвух гэтых кірунках Беларусь мае ўсё больш абмежаваныя варыянты. Стаўленне Расіі цяпер больш строгае, і яна застасоўвае невялікі прымус, калі забяспечвае субсідаванымі энергетычнымі рэсурсамі сваіх партнёраў. Зрэшты, хоць інтэграцыйныя намаганні былі млявыя, але заснаванне Мытнага саюза і рост патрэбаў Беларусі ў новых пазыках ды крэдытах узмацнілі пазіцыю Расіі ў стасунках з Мінскам.

Пазіцыя Расіі яшчэ больш падмацоўваецца прахалоднасцю ў стасунках Мінск–Брусель і ўсё большым усведамленнем марнасці гульні па Лукашэнкавых правілах, якое дэманструе ЕС. Тое, што ЕС па-ранейшаму павінен рабіць, – і тут высновы Ярабіка і Рабальяці захоўваюць сваю актуальнасць – гэта падвышаць разуменне грамадскасцю таго, што дэмакратычныя рэформы пойдуць ёй на карысць і Еўрасаюз можа зрабіць тое толькі павялічваючы сваё пранікненне ў грамадства на нізавым узроўні. Апытанне НІСЭПД паказвае, што дагэтуль ЕС не дамогся поспеху ў гэтым канкрэтным пачынанні, але гэта не азначае, што не было дасягнута зусім ніякага прагрэсу.

***Спасылкі***

Agence France Presse, 2011. Lukashenko says West “strangling” crisis-hit Belarus [электронны рэсурс]. 9 September. – Рэжым доступу: http://www.ipotnews.com/index.php?jdl=Lukashenko_says_West__strangling__crisis_hit_Belarus&level2=newsandopinion&level3=&level4=BANKING&id=623684&popular=Y. – Дата доступу: 16.03.2013.

Belarus Allowed to Pay Lower Price for Russian Natural Gas in Latter Half of 2011 // Naviny.by [электронны рэсурс]. 29 November 2011. – Рэжым доступу: http://naviny.by/rubrics/english/2011/11/29/ic_news_259_381624/. – Дата доступу: 30.07.2011.

Belarus Frees Key Opposition Figure // RFE/RL [электронны рэсурс]. 2 October 2011. – Рэжым доступу: http://www.rferl.org/content/belarus_frees_key_opposition_figure/24346193.html. – Дата доступу: 14.04.2012.

Беларусь примет 650 тысяч китайцев // Хартия’97 [электронны рэсурс]. 13 декабря 2012 года. – Рэжым доступу: http://www.charter97.org/ru/news/2012/12/13/62741/. – Дата доступу: 19.12.2012.

BelTA, 2011. Belarus Getting New Army [электронны рэсурс]. 4 November. – Рэжым доступу: http://news.belta.by/en/main_news?id=666220. – Дата доступу: 16.03.2013.

BelTA, 2012a. Banning EU Entry to Judges Contradicts Constitutions of EU States [электронны рэсурс]. 20 April. – Рэжым доступу: http://news.belta.by/en/news/politics?id=679998. – Дата доступу: 16.03.2013.

BelTA, 2012b. IMF Tells Belarus to Keep Down Government Program Lending [электронны рэсурс]. 29 October 2012. – Рэжым доступу: http://news.belta.by/en/news/econom?id=697366. – Дата доступу: 1.11.2012.

Belsat, 2012. Lithuanian Minister against Sanctions on Belarus [электронны рэсурс]. 13 April. – Рэжым доступу: http://belsat.eu/en/wiadomosci/a,7910,lithianian-minister-against-sanctions-on-belarus.html. – Дата доступу: 16.03.2013.

Bildt, Carl, Schwarzenberg, Karel, Sikorski Radek and Guido Westerwelle, 2010. Lukashenko the Loser // The International Herald Tribune, 23 December.

Bosse, Giselle, 2009. Challenges for EU Governance through Neighbourhood Policy and Eastern Partnership: the Values/Security Nexus in EU-Belarus Relations // Contemporary Politics. Vol. 15. No. 2 (June). P. 215-224.

Бугай, Мікола, 2010. Лукашэнка капітулюе і дае гарантыю. У Расіі таго не ведаюць // Наша Ніва [электронны рэсурс]. 3 ліпеня. – Рэжым доступу: http://nn.by/?c=ar&i=40579. – Дата доступу: 16.03.2013.

Cassatas, Peter, 2008. EU Lifts Travel Ban on Belarusian Leaders // Atlantic Update [электронны рэсурс]. 14 October. – Рэжым доступу: http://www.acus.org/atlantic_update/eu-lifts-travel-ban-belarusian-leaders. – Дата доступу: 13.03.2013.

Center for European Policy Analysis and Freedom House, 2011. Democratic Change in Belarus: A Framework for Action, September, Washington DC.

Ceska Pozice*,* 2011. Mikhalevich Applies for Czech Asylum [электронны рэсурс]. 18 March. – Рэжым доступу: http://m.ceskapozice.cz/en/news/politics-policy/belarus-presidential-candidate-applies-czech-asylum. – Дата доступу: 11.11.2011.

Charles, Mathew, 2011. Belarus “Tortured Protesters in Jail” // BBC News Europe [электронны рэсурс]. 1 March. – Рэжым доступу: http://www.bbc.co.uk/news/world-europe-12606265. – Дата доступу: 16.03.2013.

Charter’97*,* 2010. Даля Грибаускайте: Гарант стабильности Беларуси – это ее люди [электронны рэсурс]. 22 лістапада. – Рэжым доступу: http://charter97.org/ru/news/2010/11/22/34003/. – Дата доступу: 8.12.2010.

------, 2011. David Kramer: We Should Tighten Noose around Lukashenka [электронны рэсурс]. 1 June. – Рэжым доступу: http://charter97.org/en/news/2011/6/1/39186. – Дата доступу: 16.03.2013.

------, 2012a. Беларусь прыме 650 тысяч кітайцаў [электронны рэсурс]. 13 снежня. – Рэжым доступу: http://charter97.org/be/news/2012/12/13/62741/. – Дата доступу: 16.03.2013.

------, 2012b. Dzmitry Bandarenka: Lukashenka Knew the Entire Belarus would Rise on 20 December [электронны рэсурс]. 20 December. – Рэжым доступу: http://charter97.org/en/news/2012/12/20/630>. – Дата доступу: 16.03.2013.

CIWR, 2011. Twelve Years without Viktor Gonchar and Anatoly Krasovsky [электронны рэсурс]. 16 September. – Рэжым доступу: http://udf.by/english/main-story/47218-12-years-without-viktor-gonchar-and-anatoly-krasovsky.html. – Дата доступу: 12.11.2011.

Council of the European Union, Press release, 30 September 2011.

Coyle, James J., 2011. Russia Buying Belarus // Eurasian Energy Analysis [электронны рэсурс]. 24 June. – Рэжым доступу: http://eurasianenergyanalysis.blogspot.ca/2011/06/russia-buying-belarus.html. – Дата доступу: 10.04.2012.

Дынько, Андрэй, 2010. Чым была для Беларусі тая Перамога? // Наша Ніва [электронны рэсурс]. 9 траўня. – Рэжым доступу: http://nn.by/?c=ar&i=38284. – Дата доступу: 16.03.2013.

EPP Group in the European Parliament, 2010. Sakharov Prize – Milinkevich, EPP-ED Candidate, Wins the 2006 Award [электронны рэсурс]. 26 October. – Рэжым доступу: http://www.eppgroup.

eu/press/showpr.asp?PRControlDocTypeID=1&PRControlID=5405&PRContentID=9629&PRContentLG=en. – Дата доступу: 12.11.2011.

European Commission, 2006. EU-Belarus: New Message to the People of Belarus // Press releases RAPID [электронны рэсурс]. 21 November. – Рэжым доступу: http://europa.eu/rapid/pressReleasesAction.do?reference=IP/06/1593&format=HTML&aged=0&language=EN. – Дата доступу: 14.04.2012.

------, 2011a. First EU-Belarus Dialogue on Economic and Financial Issues [электронны рэсурс]. 12 October. – Рэжым доступу: http://ec.europa.eu/economy_finance/articles/international/2011-10-06-first-eu-belarus-dialogue_en.htm. – Дата доступу: 13.11.2011.

------, 2011b. The Policy: What is the European Neighbourhood Policy? // European Neighbourhood Policy [электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://ec.europa.eu/world/enp/policy_en.htm. – Дата доступу: 7.11.2011.

European Union External Action Service, 2006. What the European Union Could Bring to Belarus [электронны рэсурс]. November. – Рэжым доступу: http://eeas.europa.eu/delegations/belarus/documents/eu_belarus/non_paper_1106.pdf. – Дата доступу: 12.04. 2012.

EU Business, 2011. EU Must be Firm on Belarus Political Prisoners: Ministers [электронны рэсурс]. 3 September. – Рэжым доступу: http://www.eubusiness.com/news-eu/belarus-diplomacy.bzr. – Дата доступу: 16.03.2013.

EU Business, 2012. EU Sanctions “Repressive” Belarus [электронны рэсурс]. 23 March. – Рэжым доступу: http://www.eubusiness.com/news-eu/belarus-politics.ft1. – Дата доступу: 14.04.2012.

EU Council Secretariat, 2011. The EU’s Eastern Partnership, European Union Fact Sheet, 29/30 September.

International Monetary Fund, 2011a. Statement by the IMF Mission to the Republic of Belarus // Press Release No. 11/229 [электронны рэсурс]. 13 June. – Рэжым доступу: http://www.imf.org/external/np/sec/pr/2011/pr11229.htm. – Дата доступу: 14.04.2012.

------, 2011b. Statement by the IMF Mission to the Republic of Belarus Press Release No. 11/368 [электронны рэсурс]. 17 October. – Рэжым доступу: http://www.imf.org/external/np/sec/pr/2011/pr11368.htm. – Дата доступу: 16.03.2013.

Ioffe, Grigory, 2012. Belarus and Russia: Affinity and Dependency // Eurasian Daily Monitor, Vol. 9, Issue 198 [электронны рэсурс]. 30 October. – Рэжым доступу: http://www.jamestown.org/programs/edm/single/?tx_ttnews[tt_news]=40035&tx_ttnews[backPid]=27&cHash=31a2dec6c749e3392666345b562ae2db. – Дата доступу: 1.11.2012.

------, 2012. Economic Normalization and European Sanctions // Eurasian Daily Monitor, Vol. 9, Issue 68 [электронны рэсурс]. 5 April. – Рэжым доступу: http://www.jamestown.org/single/?no_cache=1&tx_ttnews[tt_news]=39231priority. – Дата доступу: 14.04.2012.

НИСЭПИ (Независимый институт социально-экономических и политических исследований), 2012a. Национальный опрос 24 сентября – 3 октября 2012 г. [электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.iiseps.org/data12-391.html. – Дата доступу: 16.03.2013.

------, 2012b. Monitoring of Public Opinion in Belarus [электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.iiseps.org/ebullet12-4.html. – Дата доступу: 16.03.2013.

Интерфакс-Запад, 2011. Лукашенко: В Беларуси создается фактически новая армия [электронны рэсурс]. 4 ноября. – Рэжым доступу: http://www.interfax.by/news/belarus/101468. – Дата доступу: 5.11.2011.

ITAR-TASS, 2011. NATO worse than Nazi [sic!] in treating Gaddafi – Lukashenko [электронны рэсурс]. 4 November. – Рэжым доступу: http://www.itar-tass.com/en/c32/264409.html. – Дата доступу: 16.03.2013.

Jarabik, Balazs and Rabagliati, Alastair, 2007. Buffer Rus: New Challenges for EU Policy towards Belarus // FRIDE, Working Paper 34 (March 2007).

Jozwiak, Rikard and Solash, Richard, 2012. Why did Slovenia Spare Belarusian Mogul from EU Sanctions? // RFE/RL [электронны рэсурс]. 28 February. – Рэжым доступу: http://www.rferl.org/content/whats_behind_slovenia_efforts_to_spare_belarus_chizh_eu_sanctions_minsk_lukashenko/24498166.html. – Дата доступу: 2.02.2013.

Korostoleva, Elena, 2009. The Limits of EU Governance: Belarus's Response to the European Neighbourhood Policy // Contemporary Politics. Vol. 15. No. 2 (June). P. 229–245.

Korovenkova, Tat'iana, 2010. EU Ambassadors Leaving Belarus // Naviny.by [электронны рэсурс]. 1 March. – Рэжым доступу: http://naviny.by/rubrics/english/2012/03/01/ic_articles_259_177034/. – Дата доступу: 14.04.2012.

------, 2013. Лукашенко и Макей обсудили пути дальнейшей активизации работы с Западом // Tut.by [электронны рэсурс]. 29 января. – Рэжым доступу: http://news.tut.by/politics/332453.html. – Дата доступу: 2 февраля 2013.

Kudrytski, Aliaksandr, 2011. Lukashenko Slams Government Plan to Stabilize Economy // Bloomberg [электронны рэсурс]. 10 November. – Рэжым доступу: http://www.bloomberg.com/news/2011-11-10/lukashenko-slams-government-plan-to-stabilize-belarus-s-economy.html. – Дата доступу: 13.11.2011.

------, 2012. Belarus Trade Deficit Narrowed 43% in 2011 as EU Exports Surged // Bloomberg [электронны рэсурс]. 16 February. – Рэжым доступу: http://www.bloomberg.com/news/2012-02-16/belarus-trade-deficit-narrowed-43-in-2011-as-eu-exports-surged.html. – Дата доступу: 3.03.2013.

Крят, Дмитрий, 2012. Все о приватизации // Беларусь сегодня [электронны рэсурс]. 31 марта. – Рэжым доступу: http://www.sb.by/post/128793/. – Дата доступу: 16.03.2013.

Leshchenko, Natalia, 2008. The National Ideology and the Basis of the Lukashenka Regime in Belarus // Europe-Asia Studies. Vol. 60. No. 8. P. 1419–1433.

Lisichonak, Siarhej, 2012. Why the Eastern Partnership Fails to Reach Belarus // Belarus Digest [электронны рэсурс]. 29 March. – Рэжым доступу: http://belarusdigest.com/print/8609. – Дата доступу: 13.04.2012.

Manaev, Oleg, Manayeva, Natalie, and Dzmitry, Juran, 2011. More State than Nation: Lukashenko's Belarus // Journal of International Affairs. Vol. 65. No. 1 (Fall/Winter).

Маненок, Татьяна, 2012. Мобилизация национализации // Беларусы и рынок. № 40 (1024), 22–28 октября. – Рэжым доступу: http://belmarket.by/ru/196/60/15440. – Дата доступу: 1.11.2012.

Marples, David R. and Padhol, Uladzimir, 2010. Belarus: a Most Peculiar Election. Part 2 // Open Democracy Russia [электронны рэсурс]. 14 December. – Рэжым доступу: http://www.opendemocracy.net/od-russia/david-marples-uladzimir-padhol/belarus-most-peculiar-election. – Дата доступу: 3.03.2013.

Marples, David, 2011. Conflicting Reports on the Sale of Belarus Potash Company // Eurasian Daily Monitor. Vol. 8. Issue 118. 20 June. – Рэжым доступу: http://www.jamestown.org/single/?no_cache=1&tx_ttnews[tt_news]=38074. – Дата доступу: 3.03.2013.

------, 2011a. Lukashenka's Friends // Eurasian Daily Monitor. Vol. 8. Issue 161 [электронны рэсурс]. 19 August. – Рэжым доступу: http://www.jamestown.org/single/?no_cache=1&tx_ttnews[tt_news]=38350. – Дата доступу: 14.04.2012.

Мельянцов, Денис и Пикулик, Алексей, 2012. Конфликт с ЕС: В поисках здравого смысла // Белорусский институт стратегических исследований [электронны рэсурс]. 10 апреля. –

Рэжым доступу: http://ru.democraticbelarus.eu/news/konflikt-s-es-v-poiskakh-zdravogo-smysla. – Дата доступу: 14.04.2012.

------, (2012)a. Последствия конфликта с ЕС: Что будет с Родиной и с нами // Naviny.by [электронны рэсурс]. 16 марта. – Рэжым доступу: http://naviny.by/rubrics/opinion/2012/03/16/ic_articles_410_177195/. – Дата доступу: 14.04.2012.

Мілінкевіч, Аляксандр [вэб-сайт]. 17 верасня 2010 года. – Рэжым доступу: http://by.milinkevich.org. – Дата доступу: 25.09.2010.

Ministry of Finance of the Russian Federation, 2011. Belarus Loan to be Granted on Condition of 3-year Privatization Program Approval – Kudrin [электронны рэсурс]. 20 May. – Рэжым доступу: http://www.minfin.ru/en/pressoffice/quotes/printable.php?id4=12754. – Дата доступу: 2.02.2013.

Наша Ніва, 2012. Мядзведзеў: Сталін ваяваў з уласным народам, а гэта найцяжэйшае злачынства // Наша Ніва [электронны рэсурс]. 30 кастрычніка. – Рэжым доступу: http://nn.by/?c=ar&i=82777. – Дата доступу: 31.10.2012.

National Legal Internet Portal of the Republic of Belarus, 2012. Belarus Ready to Sell Belaruskali for $30bn [электронны рэсурс]. 30 March. – Рэжым доступу: http://law.by/main.aspx?guid=80633. – Дата доступу: 15.04.2012.

Organization of Security and Co-operation in Europe Office in Minsk [электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.osce.org/minsk. – Дата доступу: 2.02.2013.

Preiherman, Yauheni, 2011. Belarus at the EaP Summit in Warsaw: the Meaningless Scandal // Belarus Digest [электронны рэсурс]. 3 October. – Рэжым доступу: http://belarusdigest.com/print/5983. – Дата доступу: 14.04.2012.

Pulsha, Sergei, 2010. Boycott in Favor of Lukashenko // Tretiy Put' [электронны рэсурс]. 15 December. – Рэжым доступу: http://3dway.org/en/boycott-favor-lukashenko. – Дата доступу: 16.03.2012.

Pyrkalo, Svitlana, 2012. Customs Union of Russia, Kazakhstan and Belarus is First Success in CIS Integration, says EBRD [электронны рэсурс]. 7 November. – Рэжым доступу: http://www.ebrd.com/pages/news/press/2012/121107a.shtml. – Дата доступу: 3.02.2013.

Radio Liberty, 2011. Mladenov about Lukashenko: the President Seemed Sincere [электронны рэсурс]. 19 September. Cited in http://udf.by/english/main-story/47299-mladenov-about-lukashenko-president-seemed-sincere.html. – Дата доступу: 3.03.2013.

Rettman, Andrew, 2011a. Belarus Resigned to EU Sanctions after Ashton Meeting // EU Observer [электронны рэсурс]. 12 January. – Рэжым доступу: http://euobserver.com/foreign/31631. – Дата доступу: 16.03.2012.

------, 2011b. EU Imposes Visa Ban on Belarus, Threatens Economic Measures // EU Observer [электронны рэсурс]. 31 January. – Рэжым доступу: http://euobserver.com/24/31727. – Дата доступу: 14.04.2012.

------, 2011a. EU Offers to Buy Belarus for $9 Billion // EU Observer [электронны рэсурс]. 30 September. – Рэжым доступу: http://euobserver.com/enlargement/113794. – Дата доступу: 3.03.2013.

RIA Novosti, 2011. Lukashenko Regime Has no Political Legitimacy [электронны рэсурс]. 12 January. – Рэжым доступу: http://en.rian.ru/world/20110112/162115504.html. – Дата доступу: 16.03.2013.

RT, 2012. I'm Far from a Stalin – Lukashenka [электронны рэсурс]. 16 October. – Рэжым доступу: http://rt.com/politics/lukashenko-conference-belarus-media-542/. – Дата доступу: November 2012.

Шумченко, Анатолий, 2010. Лукашенко пожинает то, что посеял // Белорусский партизан [электронны рэсурс]. 22 октября, – Рэжым доступу: http://www.belaruspartisan.org/politic/168186. – Дата доступу: 16.03.2013.

Швейц, Максим, 2012. Белорусская засада // Коммерсант-Деньги [электронны рэсурс]. № 42 (899). 22 октября. – Рэжым доступу: http://www.kommersant.ru/doc/2040906?isSearch=True. – Дата доступу: 27.10.2012.

Schwirtz, Michael, 2011. Belarus Accuses Poland, Germany, of Takeover Plot // The New York Times [электронны рэсурс]. 14 January. – Рэжым доступу: http://www.nytimes.com/2011/01/15/world/europe/15belarus.html?_r=0. – Дата доступу: 3.03.2013.

Silitski,Vitali, 2009. The Milk Split by the Milk War // European Voice [электронны рэсурс]. 24 June. – Рэжым доступу: http://www.europeanvoice.com/article/2009/06/the-milk-split-by-the-milk-war/65274.aspx. – Дата доступу: 14.04.2012.

Telegraf.by, 2011. Ashton Sets Ultimatum to Martynov [электронны рэсурс]. 12 January. – Рэжым доступу: http://telegraf.by/2011/01/ashton_sets_ultimatum_to_martynov. – Дата доступу: 20.01.2011.

Telegraf.by, 2011. IMF: Belarus Should Tighten Economic Policies [электронны рэсурс]. 17 October. – Рэжым доступу: http://telegraf.by/en/2011/10/mvf-belarusi-nujno-ujestochit-ekonomicheskuyu-politiku-obnovlyaetsya. – Дата доступу: 13.11.2011.

------, 2012a. Ministry of Transport of Lithuania: EU Policy towards Belarus Should not Harm Lithuania [электронны рэсурс]. 13 April. – Рэжым доступу: http://telegraf.by/en/2012/04/mintrans-litvi-politika-es-v-otnoshenii-belarusi-ne-doljna-vredit-litve>. – Дата доступу: 14.04.2012.

------, 2012b. "Economic Well-Being" of Belarusians Getting Stabilized [электронны рэсурс]. 29 March. – Рэжым доступу: http://telegraf.by/en/2012/03/nisepi-ekonomicheskoe-samochuvstvie-belorusov-stabiliziruetsya. – Дата доступу: 11.04.2012.

United Civil Party [электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.ucpb.org/component/content/article/62522. – Дата доступу: 30.12.2010.

Вашкевич, Андрей, 2010. Площадь – 2010 // Народная Воля [электронны рэсурс]. 20 декабря. – Рэжым доступу: http://www.nv-online.info/by/136/news/25153/. – Дата доступу: 16.03.2013.

Волянюк, Виталий, 2010a. "Поживем – увидим", Беларусь Сегодня [электронны рэсурс]. 6 июля. – Рэжым доступу: http://www.sb.by/post/102280/. – Дата доступу: 16.03.2013.

------, 2010b. "В полный колос" // Беларусь Сегодня [электронны рэсурс]. 17 июля. – Рэжым доступу: http://www.sb.by/post/102807/. – Дата доступу: 16.03.2013.